Асабістая прастора патрэбна кожнаму

СТАР. 5

Чалавек, які ўмее лятаць

СТАР. 6

Збіральнік... гальштукаў

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

18 САКАВІКА 2015 г. СЕРАДА № 51 (27909) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Бізнес павінен быць празрыстым

Усім прадпрымальнікам краіны належыць працаваць у аднолькавых умовах

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях рэгулявання і развіцця асобных відаў прадпрымальніцкай дзейнасці. Перад гэтым кіраўнік дзяржавы наведаў гандлёва-забаўляльны цэнтр «Экспабел» на ўскраіне сталіцы, паведамляе БЕЛТА. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў размове з ІП хоча знайсці кампраміс паміж іх інтарэсамі, інтарэсамі тых, хто прадастаўляе ім гандлёвыя плошчы, а таксама людзей, занятых у лёгкай прамысловасці.

Адной з праблем, якую кіраўнік дзяржавы абмяркоўваў з прадстаўнікамі прадпрымальніцтва, стала наяўнасць астаткаў несертыфікаваных тавараў, што не ўдалося рэалізаваць да 1 сакавіка 2015 года, а таксама немагчымасць атрымаць у прадаўцоў у Расіі неабходныя дакументы. «Як быць з тым, што я практычна ўзаконіў кантрабанду? — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. — У вас няма сертыфікатаў якасці, у вас няма празрыстага бізнесу». Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, ён разумее, што праблема наяўнасці сертыфікатаў якасці не першарадная. «Мяне больш за ўсё хвалюе, што мы, як дзяржава, страчваем нармальны, празрысты бізнес і забіваем сваю вытворчасць, а гэта недапушчальна», — сказаў кіраўнік дзяржавы. У краіне фактычна знікае лёгкая прамысловасць, у тым ліку з прычыны таго, што прадукцыя, якая ёю вырабляецца, менш канкурэнтаздольная ў параўнанні з таварамі, што індывідуальныя прадпрымальнікі прывозяць з-за мяжы і прадаюць у Беларусі.

«Бізнес павінен быць празрыстым, і дзяржаўны, і прыватны. Мы павінны стварыць усім аднолькавыя ўмовы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Выслухаўшы прапановы прадпрымальнікаў, Аляксандр Лукашэнка даручыў Міністэрству гандлю і прэм'ер-міністру асабіста стварыць аптовыя базы, на якіх будзе прадстаўлены тавар не толькі беларускіх вытворцаў. Кантроль за гэтым будзе ажыццяўляць кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Косінец. «Трэба іх стварыць, каб індывідуальныя прадпрымальнікі не казалі, што, акрамя Расіі, ім няма дзе ўзяць тавар», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт дадаў, што гэтае пытанне павінна прапрацоўвацца сумесна з ідывідуальнымі прадпрымальнікамі, а таксама буйным бізнесам, пры іх жаданні.

Падчас нарады Прэзідэнт заўважыў: «На жаль, ужо 10 гадоў з зайздроснай рэгулярнасцю вяртаемся да работы прадпрымальнікаў. У мінулым годзе пасля разгляду гэтага пытання на нарадзе ў Прэзідэнта і дадатковага абмеркавання з прадпрымальнікамі быў прыняты ўказ №222. У ім прадугледжвалася, што з 1 ліпеня 2014 года ўводзіцца правіла — дакументальна пацвярджаць набыццё рэалізуемай прадукцыі. Тады ж быў устаноўлены пераходны перыяд да 1 сакавіка 2015 года, каб даць магчымасць прадпрымальнікам рэалізаваць ужо ўвезеныя па старых правілах тавары. Гэта была іх просьба». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: яго інфармуюць, што за мінулы год палова прадпрымальнікаў здолела выканаць устаноўленыя дзяржавай патрабаванні і перайшла на празрыстыя метады работы. Аднак гэта зрабілі не ўсе. І цяпер яны просяць падоўжыць тэрмін продажу існуючых астаткаў тавараў, увезеных без дакументаў. Пры гэтым спасылаюцца на складанасці з рэалізацыяй, дзеянні расійскіх прадаўцоў, якія не даюць ім адпаведныя дакументы, на дарагоўлю, мізэрнасць асартыменту і нізкую якасць прадукцыі, якую можна набыць на айчынных аптовых складах, не выязджаючы за мяжу. Указваюць на тое, што нашы партнёры па Еўразійскім эканамічным саюзе не патрабуюць выканання сваімі індывідуальнымі прадпрымальнікамі аналагічных норм і гэтым ставяць беларусаў у няроўныя ўмовы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ўсе меркаванні павінны быць пачуты і ўлічаны, гэтак жа як і маральны фактар: «Людзей крыўдзіць нельга. Трэба зрабіць тонка і акуратна, каб яны не пакрыўдзіліся. Бо за кожным — сям'я».

Разам з гэтым кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што прадпрымальнікам трэба «выходзіць на нармальны, празрысты бізнес, паставіць сябе ў аднолькавыя ўмовы з іншымі. А галоўнае — каб яны працавалі сумесна з беларускай лёгкай прамысловасцю, рэалізуючы айчынныя тавары».

Прэзідэнт таксама перасцярог прадпрымальнікаў ад звязвання іх інтарэсаў з палітыкай.

Кіраўнік дзяржавы катэгарычна заявіў: з 1 студзеня 2016 года ўсе прадпрымальнікі будуць працаваць у аднолькавых умовах: «Больш адтэрміноўкі не будзе! Трэба ісці да цывілізаванай формы гандлю, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гэта ненармальна, калі мы без дакументаў сумкамі тавар возім. Гэта нават прыніжае нас».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў індывідуальным прадпрымальнікам аб'яднацца і разам падумаць над тым, як яны маюць намер працаваць з будучага года ў такіх умовах. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў выпадку неабходнасці ім будзе аказана дапамога, у тым ліку крэдытнымі сродкамі Сусветнага банка, Банка развіцця.

Па выніках нарады прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў паведаміў: ІП могуць прадаваць тавары лёгкай прамысловасці без дакументаў, якія пацвярджаюць іх набыццё, да 1 студзеня 2016 года. «Пасля 1 студзеня 2016 года работа толькі па дакументах, — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. — На працягу года роўнымі часткамі, за тры разы стаўка ПДВ будзе павышацца з 2 да 4». Што датычыцца дакументаў, якія пацвярджаюць якасць, то іх наяўнасць таксама будзе абавязковая з 1 студзеня 2016 года.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што ўлады запрашаюць індывідуальных прадпрымальнікаў да супрацоўніцтва і ў пытанні фарміравання асартыменту аптовых баз. У найбліжэйшы час будуць вызначаны структуры, якія зоймуцца падрыхтоўкай і ўвозам аптовых партый тавараў. Урад і мясцовыя органы ўлады правядуць адпаведную работу, вывучаць попыт і арганізуюць нармальны ўвоз тавараў для рэалізацыі на аптовых базах, у магазінах-складах.

НАСУСТРАЧ СВЕТУ І СВЯТЛУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛІЧБА ДНЯ

На 5,4%

павялічылася ў студзені-лютым 2015 года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ў супастаўных цэнах вытворчасць сельгаспрадукцыі ў гаспадарках усіх катэгорый краіны (у сельскагаспадарчых арганізацыях, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках, гаспадарках насельніцтва) і ў бягучых цэнах склала Br12,1 трлн (паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце). У сельгасарганізацыях аб'ём вытворчасці прадукцыі за гэты перыяд павялічыўся на 6,6%. У студзені-лютым 2015 года гаспадаркі ўсіх катэгорый рэалізавалі 257,6 тысячы тон жывёлы і птушкі на забой (у жывой вазе), што на 3,3% менш, чым за студзень-люты 2014 года, малака выраблена 1 043,4 тысячы тон (на 7,8% больш), як атрымана 558,4 млн штук (на 0,1% менш).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.03.2015 г.

Долар ЗША	15100,00	▼
Еўра	16010,00	▲
Рас. руб.	244,50	▲
Укр. грыўня	691,08	▼

■ Безнаяўны разлік

«МОЦНАЯ КАРТКА» НАБІРАЕ ВАГУ

У гэтай рэспубліканскай праграме лаяльнасці ад «БелКарт» хутка будзе ўдзельнічаць шэсць банкаў краіны

Адразу трэба нагадаць, што з моманту старту кааліцыйнай праграмы лаяльнасці ад «БелКарт» «Моцная картка» мінулі 3 месяцы. За гэты час у праграму ўступілі больш за 25 прадпрыемстваў гандлю і сэрвісу краіны, двума банкамі эмітуюцца плацежныя карткі праграмы, яшчэ 4 банкі рыхтуюцца да выпуску адзінага дысконтнага «пластыку».

БАНКІ ПАСЯБРАВАЛІ З МАГАЗІНАМІ

Праграма лаяльнасці «Моцная Картка» на базе нацыянальнай плацежнай сістэмы «БелКарт» з'яўляецца сапраўды агульнарэспубліканскім праектам, які аб'ядноўвае на адной банкаўскай плацежнай картцы дысконтныя праграмы больш за 20 розных гандлёвых сетак нашай краіны («Віталюр», «Родная старонка», «Міла», «Буслік», «Белвест» і інш.), сеткі АЗС «Беларуснафта», аптэк і іншых прадпрыемстваў сферы гандлю і паслуг. Кожны з удзельнікаў праграмы лаяльнасці прапаноўвае індывідуальныя зніжкі і бонусы трымальнікам зарплатных і асабістых картак «БелКарт» «Моцная картка».

«Галоўная мэта нашай праграмы лаяльнасці «Моцная картка» — уключыць у яе ўсе банкі-ўдзельнікі плацежнай сістэмы «БелКарт» і як мага больш прадпрыемстваў гандлю і сэрвісу краіны. Гэта праграма дазваляе трымальнікам картак «БелКарт» (пры наяўнасці ўсяго толькі аднаго пластыку, пры гэтым ён можа быць нават зарплатным) атрымліваць зніжкі і бонусы пры штодзённым здзяйсненні пакупак у гандлёвых пунктах даступнасці», — адзначыў **выканаўца абавязкаў дырэктара нацыянальнай плацежнай сістэмы Уладзімір ГУСАРАЎ**.

СТАР. 3

■ Беражыце сябе!

ГАРЫЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ТРАВА...

Не дзейнічае пераканне — падзейнічае пакаранне

Толькі за мінулыя выхадныя падраздзяленні МНС у Гродне выязджалі на тушэнне сямі ўзгаранняў сухой расліннасці — у мікрараёнах Ласосна, Баранавічы і Вішнявец.

Як правіла, у такіх выпадках ігнаруюцца элементарныя патрабаванні пажарнай бяспекі. І ўжо неаднойчы ад травы загараліся жылыя дамы і гаспадарчыя пабудовы. Што страшней, атрымлівалі апёкі і нават гінулі людзі. 15 сакавіка такая бяда здарылася на Смаргоншчыне — у рэанімацыйнае аддзяленне раённай бальніцы «хуткая дапамога» даставіла з моцнымі апёкамі жанчыну. Яна пацярпела... на сваім дачным участку. Быццам дробязь — спаліць галіны пасля абрэзкі дрэў. Аднак загарэлася сухая трава і жанчына, спрабуючы спыніць вогненную хвалю, адчула сябе дрэнна — звалілася на апаленую зямлю...

Трэба мець на ўвазе, што дым, які выдзяляецца падчас гарэння расліннасці, вельмі таксічны, шкодзіць здароўю людзей і прычыняе непапраўную шкоду экалогіі. Таму нельга дапускаць узгарынні, а калі гэта ўсё ж здарылася і ліквідаваць ачаг пажару не ўдалося, то трэба неадкладна патэлефанаваць у дзяжурную службу МНС па нумары «101» альбо «102».

За невыкананне правіл бяспекі пры спальванні сухой расліннасці прадугледжаны штраф ад 10 да 40 базавых велічынь. За раскладанне вогнішча ў забароненых месцах — у памеры 12 базавых велічынь. Як паведамілі ў Гродзенскім абласным упраўленні МНС, на стане на 16 сакавіка ўжо зарэгістраваны 114 выпадкаў загарання сухой расліннасці на плошчы 31 гектар. 39 чалавек прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці.

Б'юць трывогу і магілёўскія выратавальнікі. Нядаўна пры спальванні сухой расліннасці загінуў малады мужчына, яшчэ адзін атрымаў цяжкія траўмы. З апёкамі амаль 75% цела шпіталізаваны 53-гадовы жыхар вёскі Шалаёўка Кіраўскага раёна. Калі ён тушыў траву на сваім прысядзібным участку, на ім раптоўна загарэлася вопратка. А ў вёсцы Пясцова агонь пакінуў без даху гаспадарчую пабудову. Мяркуецца, што справа не абышлася без удзелу пажылой суседкі, якая спальвала смецце на сваім участку. Акрамя гэтага, пашкоджаны дах і сцены двух хлявоў у вёсцы Рабочы Быхаўскага раёна. І толькі дзякуючы ратаўнікам агонь не перакінуўся на найбліжэйшыя дамы. Зараз высвятляецца асоба, вінаватая ў падпальванні.

Барыс ПРАКОПЧЫК, Нэлі ЗІГУЛЯ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Заблакіравалі за прапаганду тэрарызму

Некалькі інтэрнэт-сайтаў французскага сегмента сусветнай сеткі былі заблакіраваны ў сувязі з недапушчальным зместам, які меў прыкметы «адабрэння тэрарызму». Такую інфармацыю агучыла МУС Францыі. «Дадзеная абмежавальная мера выкарыстоўваецца ўпершыню», — адзначылі ва ўнутрыпалітычным ведамстве. Увогуле пад санкцыі трапілі пяць сайтаў, якія былі абвінавачаны, у прыватнасці, у распаўсюджванні відэаролікаў радыкальнага руху «Ісламская дзяржава». Пры спробе зайсці на любы з гэтых рэсурсаў карыстальнік цяпер будзе перанакіраваны на адмысловую старонку МУС.

ЗША вызначыліся з працягласцю санкцый

Санкцыі, уведзеныя Вашынгтонам супраць Расіі з-за Крыма, будуць дзейнічаць да таго часу, пакуль паўвостраў не вернецца ў склад Украіны. Пра гэта гаворыцца ў пісьмовай заяве афіцыйнага прадстаўніка Дзярждэпартамента ЗША Джэн Псакі. Крым і Севастопаль 16 сакавіка адзначылі першую гадавіну плебісцыту, на якім большасць прагаласаваўшых выказалася за выхад са складу Украіны і ўз'яднанне з Расіяй. У Крыме за ўваходжанне ў Расійскую Федэрацыю прагаласавалі 96,77%, у Севастопалі — 95,6%.

Прынц Гары завяршае 10-гадовую кар'еру ў арміі

Чуткі аб сур'ёзных зменах у жыцці чацвёртага спадчынніка брытанскай кароны знайшлі сваё пацвярджэнне: прэс-служба Кенсінгтонскага палаца афіцыйна паведаміла, што прынц Гары звальняецца з войска пасля 10 гадоў службы. Перад вяртаннем у Лондан яму трэба прайсці інтэнсіўную чатырохтыднёвую камандзіроўку ў Аўстралію. Чым менавіта займецца пасля дэмабілізацыі капітан Уэльс, пакуль невядома — ён стаіць на раздарожжы. Прынамсі, у найбліжэйшы час прынц мае намер папрацаваць з прыродаахоўнымі арганізацыямі ў Афрыцы, а потым возьме на сябе курыраванне праграм рэабілітацыі для вайскоўцаў, якія атрымалі траўмы і раненні (удакладняе The Daily Mail). Акрамя таго, ён «актыўна разглядае і іншыя, больш доўгатэрміновыя, магчымасці працаўладкавання».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Трохразовае харчаванне — шкодны рэжым?

Большасць людзей ядуць тры разы на дзень. Але, на думку гісторыка Эбігейл Кэрал, ад гэтага рэжыму варта адмовіцца. Ён з'яўляецца культурнай надбудовай, напрыклад, карэнныя жыхары Амерыкі сілкаваліся больш правільна, пакуль не прынялі трохразовае харчаванне. Іх рэжым моцна залежаў ад сезона. Часам людзі галадалі і прапускалі прыём ежы, як адзначае The Daily Mail. Гэта падмацоўвае тэорыю аб тым, што варта 2 разы на тыдзень скарачаць каларыйнасць рацыёну да 500 калорый. Такое скарачэнне дазволіць скінуць вагу, павялічыць працягласць жыцця і знізіць ціск. Універсітэт Паўднёвай Каліфорніі, напрыклад, устанавіў: калі галадаць па 2-4 дні кожныя паўгода, можна запусціць рэжым выжывання. Арганізм пачне выкарыстоўваць запасы тлушчу, цукру, стане расшчапляць старыя клеткі. У выніку імунітэт атрымае перазагрузку, даючы гэтым лепшую абарону ад хвароб. Больш за тое, наогул няма падстаў меркаваць, што трохразовае харчаванне карыснае. Універсітэт Бата даказаў, што наяўнасць або адсутнасць сняданку ніяк не ўплывала на агульны аб'ём калорый, спажытых за дзень.

КАРАТКА

У Беларусі хутка будзе вернута свабоднае цэнаўтварэнне, але дзяржава па-ранейшаму захавае кантроль над цэнамі на сацыяльна значныя тавары. Аб гэтым паведаміла намеснік міністра гандлю Ірына Наркевіч.

Супрацоўнікі УП «Белтэхагляд», Дзяржаўтаінспекцыі і Транспартнай інспекцыі Мінтранса Беларусі з 16 па 25 сакавіка праводзяць сумесную рэспубліканскую дэкаду «Дзяржтэхагляд».

Брэсцкі абласны краязнаўчы музей у час акцыі «Брэст — культурная сталіца» правядзе ў 2015 годзе цыкл трохдзённых выставак аднаго прадмета «Унікальны экспанат».

Авіякампанія Air China з 1 мая плануе адкрыць рэгулярныя зносіны па маршруце Пекін — Мінск — Будапешт — Пекін. Рэйсы будуць выконваць чатыры разы на тыдзень: па панядзелках, серадах, пятніцах і нядзелях.

ГАТОЎНАСЦЬ НУМАР АДЗІН

Беларусь прыме чэмпіянат свету па футзале

Наша краіна зноў гатова прыняць найбуйнейшыя спартыўныя спаборніцтвы. З 17 па 25 красавіка шаснаццаць самых лепшых камандаў планеты будуць змагацца за званне чэмпіёна свету па футзале. Гульні першынства пройдуць адразу ў пяці гарадах — Мінску, Пінску, Брэсце, Маладзечне і Барысаве.

Пра гатоўнасць арганізатараў і спартсменаў да самай важнай «футзальнай» падзеі года расказаў **галоўны трэнер зборнай Беларусі і першы намеснік старшыні Беларускай федэрацыі футзала Сяргей САФОНАЎ.**

— Мы ўступаем у трэці, заключны этап падрыхтоўкі да чэмпіянату свету. Прыблізна на гэтым жа этапе знаходзіцца і зборная, перад якой пастаўлены сур'ёзныя задачы. Ужо праведзена большая частка работы ў плане прасоўвання чэмпіянату. Запушчана рэклама, прадстаўлены лагатыпы і талісманы першынства. Гэта тычыцца не толькі Мінска, але і ўсіх гарадоў, у якіх будуць праходзіць гульні чэмпіянату свету.

СТАР. 6

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

ISSN 1990 - 763X

■ Школьны расклад

ВЫПУСКНЫЯ ВЕЧАРЫ
пройдуць 11 і 12 чэрвеня

Міністэрства адукацыі вызначылася з датамі правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў, звязаных з заканчэннем навучальнага года, і выпускнымі экзаменамі. Апошнія званкі для вучняў 9-х і 11-х класаў прагучаць у гэтым годзе 30 мая. А вучэбныя заняткі для ўсіх школьнікаў завершацца 29 мая.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

З 1 па 12 чэрвеня ў школах пройдуць выпускныя экзамены. У бягучым навучальным годзе ў выпускнікоў 11-х класаў з'явіўся новы абавязковы экзамен. Калі два апошнія гады на выхадзе з сярэдняй школы вучні здавалі тры абавязковыя іспыты — па беларускай ці рускай мове, матэматыцы і замежнай мове, то цяпер гэты пералік дапоўніў вусны экзамен па гісторыі Беларусі.

Але агульная колькасць абавязковых іспытаў для выпускнікоў сярэдніх школ не змянілася. Новы абавязковы экзамен замяніў іспыт па выбары: гэта магла быць як літаратура, так і фізкультура... Цяпер жа адзінаццацікласнікі павінны будуць прадэманстраваць экзаменацыйнай камісіі свае веды па гісторыі роднай краіны.

Для выпускнікоў 2015 і 2016 гадоў экзамен па гісторыі Беларусі будзе грунтавацца толькі на тым матэрыяле, які школьнікі вывучалі ў 10-м і 11-м класах, паколькі пасля базавай школы яны іспыт па гэтай дысцыпліне ўжо здавалі.

Пад правядзенне пісьмовых іспытаў па беларускай, рускай мове і матэматыцы забраніраваны 1, 3 , 5 і 8 чэрвеня. Навучэнцы сярэдніх школ, у якіх з 2013/2014 навучальнага года было арганізавана вывучэнне гэтых прадметаў на павышаным узроўні, будуць пісаць пераказ і экзаменацыйную работу па матэматыцы па іншых заданнях.

Пасля заканчэння базавай школы вучні будуць здаваць цяпер усяго тры экзамены: беларускую мову (дыктоўку), рускую мову (дыктоўку) і матэматыку (пісьмова). Даты правядзення пісьмовых экзаменаў — 2, 4, 6 і 9 чэрвеня.

Ва ўстановах адукацыі, дзе навучанне і выхаванне вядзецца на польскай і літоўскай мовах, для навучэнцаў 9-х і 11-х класаў праводзяцца выпускныя экзамены ў пісьмовай форме па мове нацыянальнай меншасці: 21 мая — у 9-х класах і 22 мая — у 11-х класах.

Выпускныя вечары для адзінаццацікласнікаў рэкамендуецца правесці 11—12 чэрвеня. А цэнтралізаванае тэсціраванне для абітурыентаў стартуе ў краіне 14 чэрвеня.

Надзея НІКАЛАЕВА

Экзамены пасля 9-га класа:

Па беларускай мове	*(дыктоўка).*
Па рускай мове	*(дыктоўка).*
Па матэматыцы	*(кантрольная работа).*

Экзамены пасля 11-га класа:

Па беларускай ці рускай мове	*(па выбары навучэнца) у пісьмовай форме (пераказ).*
Па матэматыцы	*(кантрольная работа).*
Па замежнай мове	*(вусна).*
Па гісторыі Беларусі	*(вусна).*

■ Станоўчыя крокі

МВФ падтрымлівае дзеянні абноўленага беларускага ўрада
Аднак па-ранейшаму чакае яшчэ больш жорсткіх рэформаў

«У эканамічнай мадэлі Беларусі захоўваецца высокая ступень уразлівасці да эканамічных шокаў, што зноў наглядна праявілася ў перыяд нядаўняй нестабільнасці на рынку, выкліканай пагаршэннем знешніх умоў. Перыядычнае ўзнікненне ціску абумоўлена немагчымасцю забяспечыць устойлівы рост у рамках дзейнай мадэлі цэнтралізаванага планавання з яе празмерным рэгуляваннем», — заявіў кіраўнік місіі МВФ у Беларусі Дэвід Хофман.

Адпусціць кошты?

«Першыя крокі, зробленыя ўладамі пасля перастановак кадраў у эканамічным блоку органаў кіравання ў снежні, абнадзейвалі, — паведаміў кіраўнік місіі. — Пасля першапачатковых спроб стрымаць рост ціску на абменны курс за кошт адміністрацыйных захадаў Нацбанк дапусціў значнае паслабленне курсу беларускага рубля. Нацыянальны банк таксама пачаў пераход да больш гнуткага рэжыму абменнага курсу, хоць гнуткасць новага рэжыму яшчэ трэба праверыць на практыцы. Дзейнічаючы належным чынам, галоўны банк зрабіў больш жорсткай грашова-крэдытную палітыку. Адміністрацыйныя захады былі адменены альбо часткова знятыя, хоць поўная адмена забароны на павышэнне коштаў, якая выклікае значныя перакосы, застаецца першачарговай задачай».

Даць волю курсу?

Акрамя гэтага, на думку спадара Хофмана, крытычна важна будзе давесці да канца гэтыя першапачатковыя крокі і далей рашуча зрабіць больш жорсткай макраэканамічную палітыку, у тым ліку праз жорсткае кіраванне ўнутраным попытам у мэтах хуткага скарачэння ўнутраных і знешніх дысбалансаў. У прыватнасці, Нацбанку варта завяршыць пераход да рэжыму свабоднага курсу, які плавае, і ў поўнай меры ўкараніць рэжым таргетавання грашовай масы, накіраваны на зніжэнне інфляцыі да ўзроўню адназначных паказчыкаў.

Новая праграма

Так ці інакш, МВФ гатовы пачаць новую праграму з Беларуссю пры ўмове смелых структурных рэформаў у эканоміцы. «Для новай праграмы патрабуецца комплексны пакет структурных рэформаў, які мог бы быць падтрыманы Выканаўчым саветам МВФ», — сказаў Дэвід Хофман. Такі пакет павінен уключаць у поўнай меры гнуткі абменны курс, належную жорсткую макраэканамічную палітыку і смелыя структурныя рэформы з канцэнтрацыяй асноўных намаганняў на пачатковым этапе, дадаў ён. «Калі ўлады прадэманструюць гатоўнасць да такіх змен у сваёй эканамічнай палітыцы, то МВФ гатовы пачаць працаваць над новай праграмай», — адзначыў Дэвід Хофман.

«Мы азнаёміліся з планамі ўлад па эканамічнай палітыцы. Разглядаем яго розныя элементы», — праінфармаваў кіраўнік місіі.

* * *

Місія Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) пад кіраўніцтвам Дэвіда Хофмана знаходзілася ў Беларусі з 5 па 16 сакавіка з мэтай правядзення кансультацый па артыкуле IV з уладамі краіны. Місія правяла сустрэчы з прэм'ер-міністрам Андрэем Кабяковым, старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Паўлам Калаурам, першым намеснікам прэм'ер-міністра Васілём Мацюшэўскім, міністрам эканомікі Уладзімірам Зіноўскім, першым намеснікам міністра фінансаў Максімам Ермаловічам, а таксама з прадстаўнікамі навукова-даследчых устаноў, бізнесу і дыпламатычнай супольнасці.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ЦЕЦЯРУК З ГЛУШЦОМ, А ПОТЫМ ВАЛЬДШНЭП

З 20 сакавіка ў краіне адкрываецца сезон палявання на самцоў цецерука і глушца.

— Ён падоўжаны на гэтыя віды, згодна з новымі Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, да 10 мая (раней было да 30 красавіка), — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Аднак ніякай шкоды прыродзе не будзе, паколькі і цецярук, і глушэц адносяцца да нармаваных відаў і здабываюцца ў колькасці, вызначанай планамі вымання.

— Паляванне дазволена ў перыяд часу з 3 да 9 гадзін на такавішчах зброевым спосабам з засады, з падыходу, з выкарыстаннем наразной паляўнічай зброі з дульнай энергіяй кулі звыш 400 джоўляў, гладкаствольнай паляўнічай зброі з выкарыстаннем патронаў са шротам, а таксама паляўнічых лукаў і арбалетаў, — дадаў старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей.

З першай суботы красавіка адкрыецца паляванне на самцоў вальдшнэпа (слонкі). А з 15 мая — на самцоў казулі. Тэрміны і спосабы палявання на гэтыя віды амаль не змяніліся, за выключэннем таго, што на казулю цяпер можна паляваць кругласутачна (раней — з 18 да 9 гадзін). Таксама, як пры паляванні на цецерука і глушца, згодна з новым правіламі, дапускаецца выкарыстанне лука і арбалета. Аднак гэтыя прылады палявання павінны адпавядаць пэўным тэхнічным параметрам.

ХУТКА — ВЕСНАВАЯ ЗАБАРОНА НА ЛОЎЛЮ РЫБЫ

Сёлета ў паўднёвых абласцях краіны яна пачнецца раней за звычайны тэрмін: у Брэсцкай і Гомельскай абласцях уступіць у сілу літаральна днямі — з 20 сакавіка — і будзе доўжыцца па 18 мая.

Нагадаем, што ў сувязі з уступленнем у дзеянне новай рэдакцыі Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства тэрміны веснавой забароны на лоўлю рыбы з-за яе нерасту былі дыферэнцыраваны. Аналагічная забарона ў Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях будзе дзейнічаць з 1 красавіка па 30 мая, у Віцебскай вобласці — з 10 красавіка па 8 чэрвеня. Такая градацыя абумоўлена тым, што ў паўднёвых рэгіёнах цяплее раней, значыць, і на нераст рыба ідзе раней.

У перыяд веснавой забароны на вылаў усіх відаў рыб дазваляецца аматарскае рыбалоўства пры выкананні шэрагу ўмоў. Гэта можна рабіць адной вудай з адным кручком ці адным спінінгам, якія аснашчаны штучнай прынадай, з адным адзінарным, двайным ці трайным кручком у светлы час сутак з берага (без заходу ў ваду) ці з лёду. Таксама рыбачыць можна са штучных збудаванняў, акрамя чыгуначных і іншых мастоў, плацін, каля шлюзаў, помпавых станцый, іншых гідратэхнічных збудаванняў, у адносінах якіх устаноўлены абмежаванні і забароны на гаспадарчую і іншую дзейнасць, і на адлегласці бліжэй за 50 метраў у абодва бакі ад межаў названых гідратэхнічных збудаванняў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СПЫНІЛІ НЕЗАКОННУЮ ВЫТВОРЧАСЦЬ «ПУШЧАНСКАЙ»

У Налібоцкай пушчы выяўлена буйная самагонная вытворчасць. Гэта стала магчымым дзякуючы арганізаванаму міліцыянерам Мінскай вобласці сплаву па рацэ Іслач.

— Практыка паказвае, што ў апошні час самагоншчыкі-аптавікі, каб пазбегнуць адказнасці, усё часцей спрабуюць схаваць свае буйныя незаконныя вытворчасці ў найбольш глухіх, схаваных ад старонніх вачэй, цяжкадаступных месцах. Як правіла, гэта забалочаныя ўчасткі, якія не наведваюцца паляўнічымі, рыбаловамі і грыбнікамі, — паведаміў **начальнік аддзялення аховы правапарадку УУС Мінаблвыканкама Андрэй АМБРАЖЭЙ.**

Сплаў быў арганізаваны па Іслачы на тэрыторыі дзяржаўнага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі» ў Валожынскім раёне. За 50 метраў ад берага з лодкі былі заўважаны характэрныя сляды самагоннай вытворчасці. Пры далейшым аглядзе мясцовасці супрацоўнікі былі знойдзены сем металічных ёмістасцяў, у якіх было прыгатавана больш за тону брагі. Мяркуючы па ўсім, самагоншчыкі дабіраліся да міні-завода на лодцы, ваду для вытворчасці бралі з ракі, у якую вылівалі і адходы.

Пры далейшай праверцы вёскі Цаюны ў адным з домаўладанняў быў устаноўлены і ўладальнік незаконнай вытворчасці, жыхар Валожына, дырэктар аднаго з мясцовых прыватных прадпрыемстваў. У гаспадарчых пабудовах, якія ён арандаваў у мясцовай жыхаркі, было знойдзена 80 літраў самагонкі і лодка. Цяпер з прыцягненнем спецыялістаў лясной гаспадаркі арганізаваны работы па вывазе апарата і ачыстцы тэрыторыі заказніка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАХОДЫ ЗНІЗІЛІСЯ

Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва (грашовыя даходы за вылікам падаткаў, збораў і ўзносаў, скарэкціраваныя на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені 2015 года склалі 97,9% да ўзроўню студзеня 2014-га, паведамляе прэс-служба Нацыянальнага статыстычнага камітэта. Гэта значыць, што даходы знізіліся на 2,1%.

У агульным аб'ёме грашовых даходаў аплата працы займае 61%, ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 8,8%, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя выплаты) — 24,4%, даходы ад уласнасці і іншыя — 5,8%.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ЛЫЖКА ДЗЁГЦЮ Ў БОЧЦЫ МЁДУ

У апошнія гады вельмі папулярнымі, асабліва ў буйных гарадах, сталі кірмашы мёду і іншых прадуктаў пчалярства. Яны актыўна рэкламуюцца, пераконваючы кліентаў у выдатнай якасці тавару і выгадных цэнах. Аднак ці заўсёды так адбываецца на справе?

Так бы мовіць, лыжку дзёгцю ў бочцы мёду нядаўна выявілі ў Гродне работнікі санітарна-эпідэміялагічнай службы ў выніку аператыўнай праверкі ўдзельнікаў кірмашоў «Усходняя казка» і «Свет мёду». Аказалася, што прыватнае гандлёвае прадпрыемства «Пчолкін дом» (Мінск) прапанавала на продаж 15 найменняў мёду (243,6 кг) без дакументаў аб яго якасці і бяспецы, а таксама без неабходнай інфармацыі на этыкетцы. Лабараторныя даследаванні засведчылі, што з шасці адабраных узораў прадукцыі чатыры не адпавядаюць патрабаванням адпаведнага стандарту, які характарызуе якасць і натуральнасць мёду. Продаж гэтай прадукцыі забаранілі, а дзейнасць прадпрыемства па рэалізацыі мёду на кірмашы за парушэнне патрабаванняў санітарна-эпідэміялагічнага заканадаўства прыпынілі.

Такім чынам, набываючы мёд на кірмашах па «зніжанай» цане, пакупнік рызыкуе атрымаць няякасны харчовы прадукт. Неабходна звяртаць увагу на інфармацыю, пазначаную на этыкетцы, а таксама на наяўнасць у прадаўца дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку прадукцыі, папярэджваюць Гродзенскі абласны цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

■ Блізкая ўлада

УВАГА ДА КОЖНАЙ ПРОСЬБЫ

На «прамую лінію» да губернатара Брэстчыны Анатоля ЛІСА, як і ў мінулы раз, дазванілася 42 чалавекі. Самым значным і сур'ёзным зваротам, відаць, ёсць сэнс назваць званок з Баранавіч. Старшыня кааператыва забудоўшчыкаў Віталь Сяліцкі расказаў пра сітуацыю, якая склалася вакол двух новых дамоў. Жыллё было здадзена ў 2013 годзе. Людзі атрымалі ключы ад чаканых кватэр, засяліліся... а потым пачаліся праблемы. Справа ў тым, што ў дамах былі ўстаноўлены алюмініевыя радыятары ацяплення айчыннай вытворчасці. За час эксплуатацыі, фактычна за год, сем радыятараў пацякло, пастаянна здараюцца аварыі ў цеплапунктах.

Фота БЕЛТА.

Адзін з радыятараў знялі і адвезлі ў мінскую лабараторыю. Сталічныя спецыялісты выдалі заключэнне, што знос абсталявання складае ў розных частках ад 70 да 80 працэнтаў. Адным словам, жыць у новых дамах у ацяпляльны сезон становіцца небяспечна. Старшыня кааператыва прасіў дапамогі ў стварэнні камісіі і правядзенні незалежнай экспертызы з тым, каб прыняць рашэнне і нейкім чынам дапамагчы жыльцам новых дамоў.

Старшыня аблвыканкама ўважліва слухаў тэлефоннага суразмоўцу, задаваў пытанні, потым акрэсліў галоўнае пытанне, якое паўстае: за чый кошт давядзецца перарабляць сістэму ацяплення ў двух жылых дамах? Для гэтага патрэбна высветліць, хто ж усё-такі вінаваты ў такім няўдалым эксперыменце над жыльцамі. Наместніку старшыні аблвыканкама па будаўніцтве Віктару Сакоўскаму даручана ўзначаліць камісію, якая падрабязна разгледзіць сітуацыю з прыцягненнем кампетэнтных спецыялістаў і прыме рашэнне. Кіраўнік вобласці зазначыў, што кааператыў забудоўшчыкаў уяўляе сабой прыватную структуру, але ж проста накіраваць іх высвятляць адносіны ў судзе было б несправядліва. Улада не пакіне людзей сам-насам з іх праблемамі, а, наколькі магчыма, дапаможа заклікаць да адказу тых, хто дапусціў пралікі і паставіў няякасную альбо бракаваную прадукцыю.

Іншых жыллёвых пытанняў падчас суботняга тэлефоннага дыялогу было няшмат. Некалькі зваротаў паступіла з сельскай мясцовасці, людзі скардзіліся на завышаную ацэнку кошту дамоў і кватэр, якую правялі для будучай прыватызацыі. Губернатар адзначыў, што на кошт жылля, якое ўзводзілі ў гаспадарках некалькі дзесяцігоддзяў таму, у асобных выпадках паўплывала недакладнае вядзенне ўліку і дакументацыі. Тады маглі аднесці на жыллё іншыя траты, напрыклад, калгасныя гаспадарчыя пабудовы. А цяпер гэта адбіваецца на ацэначным кошце. Таму ў кожным выпадку службовыя асобы атрымалі даручэнне праверыць яшчэ раз парадак разлікаў.

Тры звароты датычыліся пошуку работы. Маці ўчарашняга студэнта, выпускніка Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта, прасіла за сына. Хлопец летась атрымаў інжынерную спецыяльнасць на платным аддзяленні, і да гэтай пары не здолеў уладкавацца на працу. Куды не звяртаўся малады чалавек па аб'явах, там патрабаваліся спецыялісты з вопытам працы. А дзе ўзяць той вопыт учарашняму студэнту, як не на вытворчасці? Кіраўнік жыллёвакамунальнай гаспадаркі вобласці Сяргей Лабанаў, які прысутнічаў на «прамой лініі», паабяцаў дапамагчы з першым рабочым месцам для выпускніка.

За дарослых унукаў прасіла бабуля-брастаўчанка. Адзін з іх, дарэчы, працаваў на будоўлях Масквы, а цяпер і там не хапае работы. Вярнуўся дадому, уладкавацца аказалася вельмі складана. Пра гэта пазней губернатар гаварыў з журналістамі падчас прэс-канферэнцыі. Працэнт беспрацоўя ў рэгіёне павялічылі будаўнікі з палескіх раёнаў: Століншчыны, Піншчыны, Ганцаўшчыны, якія раней працавалі ў Расіі, а цяпер паступова вяртаюцца ў родныя гарады і вёскі. І паколькі ў грамадстве ідзе актыўнае абмеркаванне будучага заканадаўчага акта па занятасці насельніцтва, людзі не хочуць доўга адпачываць, а становяцца на ўлік у цэнтрах занятасці. Гэта стварае пэўны ажыятаж.

А ў жыхароў вёскі Чарняны Маларыцкага раёна і работа ёсць у сельгаспрадпрыемстве, і жаданне займацца падсобнай гаспадаркай. Але прайшла чутка, што літаральна з красавіка малако ад вясковых гаспадароў браць не будуць. Прадпрыемства, якое займаецца перапрацоўкай, аб'явіла пра свае патрабаванні да якасці сыравіны, ім не адпавядае малако з прыватных падворкаў. Яўгенія Клебановіч тэлефанавала ад імя ўсіх заклапочаных гаспадынь. Яе папрасілі перадаць суседзям і аднавяскоўцам, што малако ў людзей будуць купляць у любым выпадку, нейкае выйсце мусяць знайсці раённыя ўлады: адмовіцца адзін перапрацоўшчык, прыцягнуць другога.

Сельскія жыхары на гэты раз праявілі сапраўдную актыўнасць. І праблемы ўзнімалі, якія заслугоўваюць увагі. Жыхар пасёлка Мухавец Брэсцкага раёна прасіў памяняць ім паліклініку. Пацыенты з названай вёскі абслугоўваюцца ў раённай паліклініцы, размешчанай у мікрараёне Рэчыца. Ім даводзіцца прыязджаць у горад і дабірацца ў яго другі канец. Але нядаўна паліклініку ўзвялі ў мікрараёне Паўднёвы, гэта якраз у напрамку Мухаўца. Такім чынам, хворым людзям не трэба было б ехаць яшчэ гарадскім транспартам, удалося б сэканоміць і час, і грошы. Старшыня аблвыканкама даручыў упраўленню аховы здароўя прааналізаваць сітуацыю, пралічыць усё і, магчыма, у будучыні правесці перадыслакацыю пацыентаў.

Ветэран сельскагаспадарчай працы, хворы на Паркінсона, прасіў канкрэтнай дапамогі, спасылаючыся на нядаўняе выступленне міністра аховы здароўя. Іван Мікалаевіч расказаў, што раней яму прызначалі прэпарат вытворчасці Славеніі, а цяпер выпісалі ўкраінскае лякарства, якое аказалася ў яго выпадку неэфектыўным. Пры названым захворванні лекі выдаюць бясплатна. І пацыент падазрае, што яму выпісалі больш танны прэпарат. Ён прасіў паспрыяць, каб вярнулі ранейшы, які дапамагае. Службовыя асобы атрымалі даручэнне ўважліва паставіцца да просьбы пенсіянера.

А вось адзін зварот вясковай шматдзетнай маці пакінуў дваістае адчуванне. Пенсіянерка, як яна назвалася, «маці-гераіня», скардзілася, што гаспадарка, дзе яна працавала, не выдзяляе ёй зваршчыка для замены ацяпляльнага катла ў доме. Вядома, ёй абяцалі дапамагчы. Але падумалася адразу, дзе ж дзеці, за выхаванне якіх жанчына атрымала ўзнагароду? Мусіць, моцна занятыя, калі не маюць часу дапамагчы маці з рамонтам.

Пра два званкі варта сказаць асобна. Жанчыны, якія дазваніліся на «прамую лінію» 17 студзеня, падзякавалі Анатолю Лісу за аператыўнае вырашэнне іх праблем.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Меркаванне

САЮЗ — НЕПАРУШНЫ
Нягледзячы на праблемы, Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі мае і дасягненні, і перспектывы

Беларуска-расійскія адносіны заўсёды з'яўляліся ключавым напрамкам для афіцыйных Масквы і Мінска. Між тым, нягледзячы на сур'ёзныя вынікі інтэграцыі і наяўнасць профільных СМІ, працэсы, якія адбываюцца ў Саюзнай дзяржаве Расіі і Беларусі, не заўсёды вядомыя і не заўсёды правільна разумеюцца нават беларускім грамадствам, не кажучы ўжо пра гіганцкія інфармацыйныя прасторы Расіі, дзе пра Беларусь і беларуска-расійскія адносіны пішуць, як той казаў, «хто ў лес, а хто па дровы».

«БЕЛАРУСКІ РАЗВАРОТ»? НЕ, НЕ ЧУЛІ

Шэраг візітаў заходніх чыноўнікаў у Мінск выклікаў у Расіі хвалю абсалютна недарэчных чутак пра нейкі «геапалітычны разварот» Беларусі, хоць нядаўнія перамовы пакуль не сведчаць нават аб нармалізацыі адносін. Бо гаворка ідзе не аб прыняцці і разуменні беларускай рэчаіснасці замежнымі партнёрамі, а аб вяртанні на зыходныя пазіцыі, для чаго ЕС і ЗША павінны адмовіцца ад практыкі дыскрымінацыі беларускіх грамадзян і юрыдычных асоб, адмяніць раней уведзеныя санкцыі і абмежаванні.

Безумоўна, да перагляду палітыкі ціску ў дачыненні да Беларусі заходнія дзяржавы падштурхоўвае не толькі ўсведамленне бесперспектыўнасці санкцый як інструмента ўздзеяння, але, у першую чаргу, змяненне становішча ў рэгіёне. Ва ўмовах грамадзянскай вайны ва Украіне Беларусь паказала сябе як надзейная дзяржава-транзіцёр расійскіх энергарэсурсаў у ЕС і як донар стабільнасці, які робіць эфектыўныя захады па аднаўленні міру. Натуральна, дыпламатычныя намаганні беларускага боку не маглі застацца па-за ўвагай сусветнай супольнасці, змяняецца стаўленне да Беларусі, але без адмовы беларускай дзяржавы ад уласных базавых прынцыпаў і суверэнітэту ў правядзенні знешняй і ўнутранай палітыкі.

Урады Беларусі і Расіі ўзгаднілі ў ходзе пасяджэння ВДС сумесны антыкрызісны план, які прадугледжвае больш за 40 праектаў супрацоўніцтва.

Прызам падобнай дыпламатычнай гульні для Беларусі ўжо стала паляпшэнне знешнепалітычнага іміджу, іншым значным вынікам з'явілася адмена санкцый ЗША ў дачыненні да кампаніі «Белнафтахім». Наступным крокам, на думку экспертаў, можа стаць зніжэнне кошту віз у дзяржавы Шэнгенскай зоны для грамадзян Беларусі, якія па малазразумелых прычынах плацяць за магчымасць наведаць ЕС практычна ў два разы больш за тых жа расіян.

ДЗВЕ СЯСТРЫ

Дзіўна, што падобныя нязначныя аспекты беларускай знешняй палітыкі на фоне маштабу еўразійскай інтэграцыі наогул прыцягваюць расійскіх публіцыстаў, але такая ўвага, нароўні з канспіралагічнымі здагадкамі аб «пераходзе на Захад» была б яшчэ зразумелая, калі б у беларуска-расійскіх адносінах наступіў нейкі «застой». Але ўсё выглядае зусім інакш, і гэты факт сведчыць аб тым, што на папулярных расійскіх рэсурсах альбо зусім не прадстаўлены сур'ёзныя эксперты па двухбаковых адносінах, альбо аглядальнікі не сочаць і не разумеюць дзеянняў не толькі беларускага, але ўласна расійскага кіраўніцтва.

Нагадаем, што 3 сакавіка ў Маскве прайшло пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі (ВДС) з удзелам прэзідэнтаў дзвюх краін. Цікава, што ў 2015 годзе гэта ўжо другая сустрэча Уладзіміра Пуціна і Аляксандра Лукашэнкі, а ў мінулым годзе лідары Расіі і Беларусі сустракаліся 11 разоў і 20 разоў размаўлялі па тэлефоне. Такая інтэнсіўнасць кантактаў звязана з тым, што ў беларуска-расійскай інтэграцыі сапраўды дастаткова сур'ёзных дасягненняў, але маецца і значная колькасць праблем, якія патрабуюць аператыўнага вырашэння.

Напрыклад, вельмі значным пытаннем стала ўзгадненне эканамічнай палітыкі Расіі і Беларусі ў перыяд эканамічнага крызісу. Падзенне аб'ёмаў узаемнага тавараабароту больш чым на два мільярды долараў ЗША ў 2014 годзе, зніжэнне айчыннага экспарту ў Расію, так званы «падатковы манеўр» расійскага ўрада ў сферы нафтаздабычы вельмі негатыўна адбіваюцца на беларускай эканоміцы, якая і так перажывае няпростыя часы ў сувязі з глыбокім крызісам асноўных рынкаў збыту. Між тым той жа спад экспарту беларускіх прамысловых тавараў на расійскі рынак выглядае досыць дзіўна з улікам расійскага імпарту, які ацэньваецца ў 500 млрд долараў штогод. У сітуацыі пэўнага валютнага дэфіцыту ў Расіі, выкліканага зніжэннем коштаў на нафту, натуральным крокам выглядае імпартазамяшчэнне за кошт уласных сіл і магчымасцяў саюзнікаў з пераходам на ўзаемаразлікі ў нацыянальнай валюце. Урады Беларусі і Расіі ўзгаднілі ў ходзе пасяджэння ВДС сумесны антыкрызісны план, які прадугледжвае больш за 40 праектаў супрацоўніцтва. Цікава, што ўжо 10 сакавіка, гэта значыць, усяго праз тыдзень пасля саміту ВДС, Прэзідэнт РФ даў даручэнне Банку Расіі і ўраду «вызначыць далейшыя напрамкі інтэграцыі ў валютнай і фінансавай сферах у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза з прапрацоўкай мэтазгоднасці і магчымасці стварэння ў перспектыве валютнага саюза». Гэта заданне кіраўніка дзяржавы павінна быць выканана ва ўзаемадзеянні з цэнтральнымі банкамі дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза (Расія, Беларусь, Казахстан, Арменія) да 1 верасня 2015 года.

У 2015 годзе гэта ўжо другая сустрэча Уладзіміра Пуціна і Аляксандра Лукашэнкі, а ў мінулым годзе лідары Расіі і Беларусі сустракаліся 11 разоў і 20 разоў размаўлялі па тэлефоне. Такая інтэнсіўнасць кантактаў звязана з тым, што ў беларуска-расійскай інтэграцыі сапраўды дастаткова сур'ёзных дасягненняў, але маецца і значная колькасць праблем.

Не засталіся без увагі ўлад Расіі і Беларусі і іншыя пытанні, якія ў экспертным асяроддзі прынята называць «тэхнічнымі». Аднак, як паказвае практыка, часта менавіта гэтыя «тэхнічныя пытанні» маюць найбольш сур'ёзнае значэнне для арганізацыі паўсядзённага жыцця радавых грамадзян. Па выніках пасяджэння ВДС былі таксама падпісаны наступныя пагадненні: аб парадку ўзаемнага выканання судовых пастаноў па справах аб спагнанні аліментаў; аб узаемным прызнанні і парадку выканання рашэнняў аб адмове ва ўездзе на тэрыторыю дзяржаў — удзельніц Саюзнай дзяржавы; аб парадку абмену звестак аб грамадзянах Беларусі і Расіі, у дачыненні да якіх дзейнічаюць абмежаванні на выезд.

ЗА ПРАЦУ, ТАВАРЫШЫ!

Такім чынам, можна канстатаваць, што большасць ключавых пытанняў беларуска-расійскіх адносін знайшлі сваё непасрэднае вырашэнне ў ходзе саміту ВДС, былі таксама вырашаны планавыя, працоўныя моманты інтэграцыі. Пры гэтым беларускі бок быў і застаецца драйверам збліжэння, а Саюзная дзяржава — крэатыўнай пляцоўкай еўразійскай інтэграцыі. Вядома, няпэўныя тэрміны пераходу на адзіную валюту ЕАЭС, фарміраванне энергетычнага рынку толькі да 2025 года, адсутнасць адзінства аграпрамысловай палітыкі і слабасць інстытуцыйнай дысцыпліны лічацца ў Беларусі недапушчальнымі і крытыкуюцца на ўзроўні вышэйшых службовых асоб. Аднак гэтая крытыка цалкам абгрунтаваная і не адмяняе неабходнасці далейшай працы па збліжэнні.

На жаль, вынікі саміту ВДС практычна не атрымалі якаснага аналітычнага суправаджэння ў перыядычным друку, а асобныя беларускія і расійскія публіцысты гарачымі фактамі і міфатворчасцю спрабуюць падмяніць інтэграцыйную рэальнасць Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі. Тым не менш, 15-гадовы вопыт узаемадзеяння даказаў жыццяздольнасць праектаў інтэграцыі на постсавецкай прасторы, курс на збліжэнне карыстаецца безумоўным даверам расійскага і беларускага народаў, а далейшыя перспектывы цалкам залежаць ад выканання бакамі сваіх абавязацельстваў і дасягнутых дамоўленасцяў.

Аляксандр ШПАКОЎСКІ

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «МЕХКОЛОННА №93»!

Открытое акционерное общество «Мехколонна №93», находящееся по адресу: 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 13, телефон 8-0172918736, извещает своих акционеров, что в объявлении о покупке акций собственного выпуска Открытого акционерного общества «Мехколонна №93» с целью их аннулирования, опубликованном 10 марта 2015 г. в газете «ЗВЯЗДА», вместо слов «Дата окончания покупки акций: 30 (тридцать) дней с момента принятия решения о приобретении акций» следует читать «Дата окончания покупки акций: 05 апреля 2015 г.

ВЯЛІКІ ПОДЗВІГ МАЛЫХ

Як ствараўся батальён беларускіх арлянят, і хто былі яго першыя байцы?

Рана асірацеўшы, яны нароўні з дарослымі змагаліся супраць ворага. Былі разведчыкамі, падрыўнікамі, сувязнымі, кулямётчыкамі, ад'ютантамі армейскіх і партызанскіх камандзіраў. Разам з чырвонаармейцамі гналі нямецка-фашысцкіх захопнікаў з беларускай зямлі, вызвалялі краіны Заходняй Еўропы. На іх дзіцячых гімнасцёрках ззялі баявыя ордэны і медалі. Толькі ў партызанскіх атрадах і падполлі Беларусі змагалася 25 тысяч непаўналетніх байцоў! Так дзеці дапамагалі дарослым набліжаць такую доўгачаканую Перамогу.

Яшчэ ў канцы 1944 года газета «Піянер Беларусі» прапанавала сабраць і надрукаваць успаміны юных удзельнікаў і сведак Вялікай Айчыннай. Задуму падтрымалі Кандрат Крапіва і Янка Маўр — і ў 1948 годзе выйшаў зборнік «Ніколі не забудзем», які не раз перавыдаваўся, бо імгненна знікаў з кніжных паліц.

А напярэдадні 30-годдзя Вялікай Перамогі і 50-й гадавіны піянерскай арганізацыі газета «Зорька» выступіла з грамадскай ініцыятывай — сабраць юных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія змагаліся з ворагам. «Знойдзем юных герояў, напішам новыя старонкі піянерскага летапісу!», — заклікала рэспубліканскае піянерскае выданне. І паляцелі ў рэдакцыю лісты-апавяданні чырвоных следапытаў, школьнікаў і піянераў Беларусі, успаміны саміх сыноў палка. Так нарадзіўся славуты батальён беларускіх арлянят.

«Мы ніколі не пераможам рускіх, бо нават дзеці ў іх змагаюцца і гінуць як героі», — пісаў нямецкі салдат у сваім дзённіку ў студзені 1944-га.

Усяго ў ім налічвалася каля 700 чалавек. Сёння іх засталося толькі каля трохсот... Аднак батальён паранейшаму існуе. Толькі, відаць, больш ва ўспамінах. Як усё пачыналася тады, у сакавіку 1971-га, памятае і адзін з яго арганізатараў — былы супрацоўнік газеты, кандыдат гістарычных навук Віталь Лукін.

— Аднойчы ў рэдакцыю прыйшоў вядомы журналіст Валянцін Дончык і прапанаваў стварыць батальён беларускіх арлянят, — расказвае Віталь Лукін. — Сустрэча адбылася ў пачатку сакавіка 1971 года, а ўжо 12 сакавіка нумар газеты выйшаў са зваротам да чытачоў: «Пачынаем аперацыю «Подзвігі юных». Створым батальён беларускіх арлянят! Дасылайце свае данясенні».

Побач быў змешчаны загад № 1, у якім гаварылася, што ў батальён залічваецца кожны, хто быў сынам або дачкой палка, партызанскага атрада, юным падпольшчыкам у 1941—1945 гадах. Неабходна было даслаць у рэдакцыю дакументы, фотаздымкі і падрабязныя аповеды аб іх баявой дзейнасці. Удакладнялася, што ў ганаровыя юныя байцы залічвалі і тых, хто аддаў жыццё за Радзіму. Пад загадам стаяў подпіс камандзіра батальёна беларускіх арлянят, аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі, Героя Савецкага Саюза Віктара Лівенцава. Ганаровым камісарам батальёна стала рэдактар газеты Настасся Мазурава.

Дарэчы, сынам палка быў і сам Валянцін Дончык. Калі пачалася вайна, яму было 10 гадоў. Разам з байцамі 2-га кавалерыйскага корпуса імя Даватара юны сяржант дайшоў да Берліна, распісаўся на рэйхстагу. Сярод дзесяці яго франтавых узнагарод — медаль «За адвагу».

Аднымі з першых у батальён былі залічаны Героі Савецкага Саюза Марат Казей і Зіна Партнова, гаўрошы Брэсцкай крэпасці. Пасмяротна. Тут жа адгукнуўся Герой Савецкага Саюза Антон Брынскі: «Вы робіце вялікую, высакародную справу. Прашу залічыць у батальён Ваню Кавалёва».

— Услед за гэтым у рэдакцыю прыйшоў ліст ад былога сакратара Мінскага падпольнага абкама партыі Героя Савецкага Саюза Рамана Мачульскага з просьбай пасмяротна залічыць у батальён сувязную Плешчаніцкага падполля Зіну Іваноўскую, — успамінае Віталь Лукін. — У гады вайны, як пісаў Мачульскі, у Плешчаніцах, што на Міншчыне, актыўна дзейнічала савецкае падполле. Юная піянерка хадзіла з пасёлка ў партызанскі атрад, каб перадаць партызанам неабходную інфармацыю, дакументы, медыкаменты. Аднойчы, выконваючы баявое заданне, Зіна нарвалася на паліцаяў. Некалькі дзён фашысты здзекаваліся з дзяўчынкі. Так нічога не даведаўшыся, кінулі яе сабакам.

У памяці былога супрацоўніка «Зорьки» — і паведамленні ад чырвоных следапытаў з Барысава. Вось што яны паведамлялі: «У нашым горадзе на сцяне Дома піянераў вісіць мемарыяльная дошка. На ёй напісаны імёны: Віця Пашкевіч, Саша Клімовіч, Валя Сакалова, Міша Бутвіноўскі. Гэтыя падлеткі восенню 1941 года арганізавалі падпольную піянерскую групу. Яны выносілі з варожых складоў боепрыпасы, распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, дапамагалі падпольшчыкам арганізоўваць уцёкі ваеннапалонных з фашысцкіх канцлагераў і перанакіроўваць іх у партызаны. Старэйшы ў групе быў Віця Пашкевіч, шасцікласнік...»

У маі 1945 года адзін фотаздымак абляцеў старонкі шматлікіх газет свету. На ім на прыступках толькі што ўзятага рэйхстага разам з ваеннымі разведчыкамі адлюстраваны хлопчык, сын аднаго з палкоў 150-й стралковай дывізіі — той самай, байцы якой Ягараў, Бераст і Кантарыя ўзнялі сцяг Перамогі над рэйхстагам. Праўда, сённяшнія навукоўцы аспрэчваюць гэты факт і сцвярджаюць, што на сусветна вядомых фотаздымках Яўгена Халдзея «Сцяг Перамогі над Рэйхстагам» — вайскоўцы 8-й гвардзейскай арміі Аляксей Кавалёў, Абдулхакім Ісмаілаў і Леанід Горычаў. Аднак не гэта ў дадзеным выпадку галоўнае, тут важна іншае: маленькі Жора Арцёменкаў, пераадолеўшы сотні кіламетраў франтавых дарог, нароўні з байцамі Чырвонай Арміі дайшоў да Берліна! За баявыя заслугі радавы Арцёменкаў быў узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй». Менавіта ён стаў першым байцом батальёна беларускіх арлянят.

Яны выносілі з варожых складоў боепрыпасы, распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, дапамагалі падпольшчыкам арганізоўваць уцёкі ваеннапалонных з фашысцкіх канцлагераў і перанакіроўваць іх у партызаны. Старэйшы ў групе быў Віця Пашкевіч, шасцікласнік...»

Вось што ўспамінаў сын палка Гена Юшкевіч: «Наша падпольная група «Джэк», якая ўвайшла ў каталог лепшых разведак свету, апынулася ва Усходняй Прусіі ў сярэдзіне лета 1944 года. Наша мэта ў асноўным была ў тым, каб фіксаваць рух транспарту ў бок фронту, выяўляць сакрэтныя аб'екты, наяўнасць тэхнікі ў кожным раёне. Выконваючы заданне, мы апынуліся ў раёне гітлераўскай стаўкі «Воўчае логава». Выкарыстаўшы гэтыя разведданыя, злучэнні Чырвонай Арміі знішчылі ворага ў яго ж логаве. Усё гэта патрабавала ад нас неверагодных намаганняў. Яшчэ доўга наша дзейнасць была пад грыфам «сакрэтна». Але час ішоў, і пра нашы справы стала шырока вядома...»

Разведчыкі «Джэка» былі вачамі і вушамі 3-га Беларускага фронту. Людзей, якія пратрымаліся тут хаця б месяц, лічылі доўгажыхарамі. Усходняя Прусія, куды быў закінуты ў складзе разведгрупы і Генадзь Юшкевіч, была сапраўдным пеклам для разведчыкаў. Тут, каля Рэстэнбурга, знаходзілася штаб-кватэра Гітлера, якую называлі «Воўчым логавам». Рэгіён знаходзіўся пад асабістым кантролем Гімлера. За тыдзень да высадкі «Джэка» рэжым стаў яшчэ больш жорсткім: быў здзейснены замах на жыццё фюрара.

Салдаты 150-й стралковай дывізіі на прыступках рэйхстага. На пярэднім плане — 14-гадовы сын палка Жора Арцёменкаў.

Таму ніводзін самалёт не мог праляцець незаўважаным...

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а.

Тел./факс 204 67 99, 399 53 94.

Режим работы – 8.45–18.00, обед 13.00 – 14.00; пятница 8.45-16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Объект «Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланкавыд» по ул. Я. Мавра, 32А».

3-й пусковой комплекс:

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не сост

Краіна здароўя

Выпуск № 5 (335)

■ Доктар адкажа

ДАВАЙ ХУТЧЭЙ, МЕТАБАЛІЗМ!

«Раскажыце, калі ласка, як паскорыць метабалізм?

Алеся,

Гродзенская вобласць».

Тлумачыць **участковы тэрапеўт 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна ПАРХОМЕНКА:**

— Метабалізм — той працэс, які дапамагае арганізму выпрацоўваць і расходаваць энергію, гэта ўся тая «хімія», якая адбываецца ад моманту паступлення пажыўных рэчываў у арганізм да моманту поўнага развітання з усім гэтым.

Для зручнасці разглядаюць два бакі метабалізму — анабалізм і катабалізм. Першы звязаны з затратай энергіі, другі суправаджаецца яе вызваленнем.

Хуткасць, з якой арганізм расходуе энергію і спальвае калорыі — як мне здаецца, вас цікавіць менавіта гэты момант — моцна адрозніваецца ў залежнасці ад полу, узросту, масы цела, фізічнай падрыхтоўкі, целаскладу, працягласці і інтэнсіўнасці работы, характару харчавання, ад генетычных, гарманальных і некаторых іншых фактараў.

Самы істотны ўплыў на метабалізм аказвае ўзрост. Абменныя працэсы ў арганізме дарослага кожныя 10 гадоў запавольваюцца на 7-10 працэнтаў. Гэта часткова звязана са змяншэннем актыўнасці і зніжэннем колькасці мышачнай масы. З узростам пры недахопе фізічнай нагрузкі мышцы замяшчаюцца тлушчавай тканкай, а ў ёй абмен рэчываў працякае ў 3 разы павольней, чым у мышцах. Запавольванне метабалізму часта прыводзіць да атлусцення і розных захворванняў, абумоўленых лішняй вагой.

Парушэнні хуткасці абмену рэчываў могуць быць і ў маладым узросце, калі ў арганізме няма балансу паміж спажываннем і расходам энергіі.

У мужчын абменныя працэсы працякаюць хутчэй — у іх больш мышцаў і менш тлушчавай тканкі.

Паскорыць метабалізм можа кожны — за кошт змены харчовага рацыёну і ладу жыцця.

✓ Прымайце ежу 5 разоў на дзень невялікімі порцыямі. Дробнае харчаванне дапамагае захоўваць стабільны ўзровень цукру ў крыві і папярэджвае пераяданне.

✓ Ужывайце дастатковую колькасць бялкоў, менш жывёльных тлушчаў і простых вугляводаў (цукру і кандытарскіх вырабаў).

✓ Не прапускайце сняданак (гэта павінна быць 30% ад усяго дзённага рацыёну), у якім павінны быць бялкі, тлушчы і вугляводы.

✓ Апошні прыём ежы — не пазней за 4 гадзіны да сну.

✓ Піце дадатковую колькасць вады. Вада — найважнейшы складнік метабалізму, яе нястача запавольвае абмен рэчываў. Халодная вада карысная ў гэтым сэнсе тым, што арганізму давядзецца затраціць энергію на яе саграванне.

Прадукты, якія паскараюць метабалізм:

- бялковыя прадукты (любое поснае мяса, яечны бялок);
- марская рыба (сёмга, фарэль, скумбрыя, сардзіны);
- аўсяныя шматкі (з цэлага зерня);
- нятлусты ёгурт;
- чырвоны востры перац чылі;
- карыца, кары, травы;
- зялёны чай, кава;
- грэйпфрут, лімон;
- яблыкі, грушы, ківі;
- брокалі, шпінат;
- марскія водарасці і морапрадукты;
- імбір, асабліва марынаваны.

Пра імунамадулятары і вірусы

■ Лечымся правільна

Вірусы гінуць пры тэмпературы звыш 60 градусаў, кварцаванні на працягу 20-30 хвілін, пад уздзеяннем тлушчарастваральнікаў — мыла, дэзынфектантаў... А вось у арганізме чалавека ім надта добра. Нават непрацяглы кантакт, скажам, з носьбітам грыпу здольны прывесці да заражэння.

Вакцынацыя, вядома, не гарантуе абсалютнай адсутнасці заражэння, аднак гэтая мера сапраўды дзейсная. Дзякуючы ёй у нашай краіне каторы год няма грыпознай эпідэміі. Праўда, вакцынавацца трэба было яшчэ ўвосень. Куды менш дзейснай спецыялісты лічаць стымуляванне імуннай сістэмы з дапамогай спецыяльных лекавых прэпаратаў — імунамадулятараў. На Захадзе гэта даўно не вітаецца. Замежныя спецыялісты лічаць, што сур'ёзнай доказнай базы ў дачыненні да прафілактычнага эфекту многіх імунамадэлюючых прэпаратаў няма.

Як вядома, імунамадулятары скіраваныя на ўмацаванне неспецыфічнага імунітэту, павелічэнне ў арганізме колькасці інтэрферонаў — ахоўных рэчываў, якія ствараюць неспрыяльныя ўмовы для размнажэння самых розных вірусаў. Аднак прымяненне такіх імунамадулятараў, як імунал, імунафан, лікапід, грапрынасін, прэпараты эхінацэі і іншых не гарантуе, што мы пазбегнем заражэння. Спрацаваць можа хіба псіхалагічны фактар, наша вера ў тое, што за вялікія грошы мы робім для сябе нешта карыснае.

Праўда, злоўжыванне апошнімі можа знясіліць імунны рэсурс арганізма. Так што самым важным у прадухіленні заражэння быў і застаецца здаровы лад жыцця, добры сон, паўнацэннае, з вялікай колькасцю садавіны і гародніны, харчаванне, належная фізічная актыўнасць і пазітыўны настрой. Не варта скідваць з рахунку рэгулярныя прагулкі на свежым паветры ў любы час года, паступовае, з ранніх гадоў, загартоўванне. Плюс вітамінныя, антыаксідантныя комплексы з селенам, цынкам.

Наогул існуе шэраг эфектыўных прэпаратаў, здольных трымаць вірусы пад кантролем, прадухіляць абвастрэнні. Самастойна, без урачэбнай кансультацыі прымаць такія лекі не рэкамендуецца. Тут як з антыбіётыкамі. Калі іх піць, то ў паўнавартаснай дозе і поўным курсам, паколькі да супрацьвірусных прэпаратаў таксама можа развівацца ўстойлівасць. Пры наступных абвастрэннях лячэнне даводзіцца праводзіць значна больш таксічнымі прэпаратамі.

Лячэнне вострых рэспіраторных вірусных інфекцый і грыпу павінна быць комплексным:



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

- хатні рэжым,
- прыём супрацьвірусных лекаў,
- дэзынтаксікацыя (ужыванне морсаў, кампотаў, гарбаты),
- зняцце сімптомаў з дапамогай фервексу, тэрафлю, ВРВІколду.

Пры развіцці сардэчнай, сасудзістай, дыхальнай недастатковасці, тромбагемарагічнага сіндрому прызначаецца спецыяльная тэрапія.

Самым важным з'яўляецца ранні пачатак супрацьвіруснай тэрапіі.

Калі на 7-10 дзень інфекцыя пайшла ўгору (вушы, нос) і з'явіўся атыт, гаймарыт, або ўніз (бронхі, лёгкія) і з'явіўся бранхіт, пнеўманія, размова ідзе пра ўскладненні. Ускладненне праяўляецца не толькі далучэннем новых сімптомаў, але і падаўжэннем гарачкі, пачаткам яе другой хвалі. Пры няўскладненым грыпе гарачка працягваецца не даўжэй за 5-6 дзён.

Антыбіётыкамі грып і іншыя ВРВІ не лечацца, але іх могуць прызначаць пры высокай рызыцы развіцця ўскладненняў. З антыбіётыкамі трэба быць асцярожным, паколькі яны, з аднаго боку, абараняюць нас ад бактэрый, а з другога, парушаюць мікрафлору, якая таксама выконвае ў арганізме ахоўную функцыю. Аднак калі вам прызначылі такую групу прэпаратаў, не варта панічна іх баяцца. Трэба строга выконваць рэкамендацыі ўрача ■

■ Асаблівасці абследавання

САМЫ ПРОСТЫ АНАЛІЗ

— Аналіз мачы ў першую чаргу неабходны для таго, каб выявіць характэрныя для захворванняў адхіленні ў абмене рэчываў. Гэты аналіз заключаецца ў вывучэнні агульных уласцівасцяў мачы, хімічным і мікраскапічным даследаванні, — гаворыць **загадчыца клініка-дыягнастычнай лабараторыі 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Вера КОЛТУН.**

У норме мача мае даволі светлы колер, «фарбавацца» яна можа падчас ужывання некаторых прадуктаў і лекаў.

Кіслотнасць. Мача здаровых дарослых пры звычайным харчаванні мае сярэдняе значэнне pH 6,25. Ваганні гэтага значэння звязаныя з характарам харчавання: мясная дыета дае кіслую рэакцыю мачы, а раслінная — шчолачную. Пры змешаным харчаванні ў арганізме ўтвараюцца галоўным чынам кіслыя прадукты абмену. Кіслотнасць мачы павялічваецца пры цукровым дыябеце, туберкулёзе нырак, ныркавай недастатковасці.

Шчыльнасць. Залежыць ад канцэнтрацыі раствораных у ёй бялку, глюкозы, мачавіны і соляў натрыю, колькасці выпітай вадкасці, характару з'едзенага. Калі шчыльнасць ранішняй мачы роўная або крыху большая за 1,018, гэта выключае неабходнасць далейшага даследавання з дапамогай спецыяльных проб. Вельмі высокія або нізкія лічбы шчыльнасці патрабуюць высвятлення прычын.

Бялок. У норме ў ранішняй мачы бялок не выяўляецца. Існуе вялікая колькасць якасных і колькасных метадаў вызначэння бялку ў мачы. Часам пры наяўнасці бялку мача становіцца мутнай. Пры інфекцыі мачавой сістэмы могуць быць сляды бялку ў межах 0,033-0,066 мг/л. Пратэінурыя можа быць пастаяннай (калі выяўляецца цягам многіх тыдняў) і часовая (падчас гарачкі і інтаксікацыі).

Глюкоза. У норме не вызначаецца. Яе з'яўленне можа быць вынікам гіперглікеміі.

Эрытрацыты. Звычайна не выяўляюцца або могуць быць адзінкавымі. Пры большай колькасці мача становіцца чырвонай, што можа быць пры гламеруланефрыце, піеланефрыце, пухліне ныркі, пашкоджанні мочавыводных шляхоў, цяжкай фізічнай нагрузцы.

Лейкацыты. У норме адзінкавыя. У мужчын ад 0 да 3, у жанчын — ад 0 да 5 у полі зроку. Павелічэнне колькасці сведчыць аб запаленчых працэсах у нырках або мочавыводных шляхах.

Цыліндры. Выяўленне адзінкавых — норма. Калі іх шмат, прызначаюць даабследаванне.

Эпітэліяльныя клеткі. Плоскі эпітэлій у норме не перавышае 1-2 у полі зроку. Калі больш, падазраюць запаленне ў мачавым канале, мачавым пузыры, похве. З'яўленне цыліндрычнага эпітэлію сведчыць аб запаленні ў мачаводзе, ныркавай лаханцы.

Бактэрыі. Вялікая колькасць мікробаў патрабуе бактэрыялагічнага даследавання мачы (пасеў на флору).

Спецыяльныя метады даследаванняў мачы праводзяцца толькі па прызначэнні ўрача ■

■ Ваш выбар

У заўзятых курцоў — карыес зубоў

Курэнне шкодзіць усім сістэмам арганізма, аднак першае, што трапляецца шкодным рэчывам на шляху — зубы. Карыес — гэта, вядома, не рак лёгкага або інсульт, не язвавая хвароба або эндаартэрыт (захворванне артэрый), але...

Паводле слоў **урача-стаматолага-тэрапеўта 9-й стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Алены СЫРАЕГІНАЙ,** сярод курцоў у 2 разы больш людзей, якія не маюць ніводнага зуба пасля 65 гадоў. Пачынаецца ўсё з налёту, які ўтвараецца вельмі хутка з-за пастаянна высокай сухасці ў роце. Сліна ў курца выдзяляецца ў малой колькасці, а таму не здольна хоць неяк змываць і абараняць рот ад шматлікіх бактэрый. Далей церпяць дзясны — парушаецца кровазварот, пашкоджваецца слізістая, з'яўляецца кроватачывасць і запаленне.

Стаматолагі добра ведаюць: калі перад табой курэц, можна і без агляду сказаць, што ў яго ёсць множны карыес. А карыес наогул лёгка пераходзіць ад аднаго зуба да другога. Пакуль далечыш адзін зуб, можаш брацца за іншы. А не лячыць нельга, таму што напярадзе выдаленне і пратэзаванне. Аднаўляюцца ж курцы пасля любога хірургічнага ўмяшання дрэнна. Імплантаванне часам немагчымае. Слізістая аказваецца цалкам загубленай канцэрагенамі. Паступова з'яўляецца лейкаплакія паднябення — амаль нябачная бялёсая плёнка на паднябенні, а скончыцца ўсё можа ракам слізістай ротавай поласці і губы. На фоне хворых зубоў абавязкова слабее імунная сістэма, чалавек становіцца больш схільным да розных інфекцый.

Ніякая зубная паста не дапаможа папярэдзіць разбуральнае дзеянне дыму на зубы і слізістую.

Калі вы яшчэ не развіталіся з жудаснай звычкай, матывуйце сябе як мага хутчэй, бо адмова ад цыгарэт гарантуе вам:

адсутнасць непрыемнага паху з рота;

магчымасць знізіць частату наведвання стаматолага;

змяншэнне рызыкі развіцця вялікай колькасці захворванняў, у тым ліку стаматалагічных ■

40+: ПЕРАХОДНЫ ЎЗРОСТ

■ Жаночая тэма

Кар'ера ў парадку, дзеці падраслі, можна шмат працаваць і ўсё яшчэ заставацца маладой. Аднак чамусьці ўсё часцей з'яўляюцца стомленасць, раздражненне, незадаволенасць знешнім выглядам. Вось яно — жыццё пасля сарака. Што ж адбываецца з нашым арганізмам?

Мяняецца гарманальны фон. Яечнікі працуюць менш актыўна, змяншаецца ўзровень эстрагенаў. Зніжаецца функцыя шчытападобнай залозы. Мяняецца стан скуры, нервовай сістэмы і абмену рэчываў. Адсюль маршчынкі, пігментацыя, тусклыя валасы, ломкія пазногці, ваганні настрою, павелічэнне вагі.

— Ужо нават пасля 30 гадоў можа пачацца паступовае спыненне месячных, — гаворыць **акушэр-гінеколаг 12-й гарадской паліклінікі г. Мінска Вольга ГРЫШАНКОВА.** Натуральным гэты працэс лічыцца ва ўзросце ад 40 да 50. Час, калі яечнікі выпрацоўваюць усё менш эстрагену, называецца прэменапаўзай. Яна працягваецца да самай менапаўзы, калі яечнікі спыняюць выпрацоўку яйцаклетак. У апошнія два гады прэменапаўзы ўзровень эстрагенаў зніжаецца даволі рэзка. Менапаўза надыходзіць, калі месячныя адсутнічаюць, сама меней цягам 12 месяцаў. Звычайна ў 45-55 гадоў (раней — у 40-45, позняя — пасля 55). У выпадку наступлення менапаўзы да 40 гадоў гавораць пра сіндром ранняга знясілення яечнікаў.

ЦЯЖКА НЕ ЗАЎВАЖЫЦЬ

У кожнай жанчыны клімакс праяўляецца па-рознаму. Усё залежыць ад агульнага стану здароўя і спадчыннасці. Аднак ёсць агульныя «нязручнасці», знаёмыя амаль усім.

БЯССОННІЦА. Палавыя гармоны ўплываюць на зоны мозга, якія адказваюць за наладку біялагічных гадзін. Бяссонніца ноччу часта суправаджаецца санлівасцю ўдзень. Ад парушэння сну пакутуе прыкладна кожная трэцяя жанчына ў клімаксе.

ПРЫЛІВЫ. Непрыемны стан, які працягваецца ад некалькіх хвілін да паўгадзіны. Раптоўная гарачка ў верхняй частцы цела, паскарэнне пульсу, павышэнне тэмпературы, потааддзяленне, з'яўленне чырвоных плям на твары і грудзях. З такім сімптомам сутыкаецца прыкладна 85 працэнтаў жанчын. Звычайна гэта знікае праз 1-1,5 года пасля апошняй менструацыі, аднак у кожнай пятай захоўваецца цягам 5-10 гадоў.

РАЗДРАЖНЕННЕ. У дрэннага настрою ёсць не толькі суб'ектыўныя прычыны, але і аб'ектыўныя. Медыцынскія. Мазгавыя цэнтры, якія кантралююць гарманальную сістэму, цесна звязаны з зонамі кіравання эмоцыямі. Адсюль трывожнасць, раздражненне, слязлівасць, нервознасць і нават дэпрэсіі.

ЛОМКІЯ КОСЦІ. Разам з эстрагенам арганізм губляе кальцый, таму косці становяцца порыстымі і крохкімі. Падчас клімаксу кожны год жанчына губляе 2-3% касцявой масы, а гэта ў выніку можа прывесці да таго, што косці будуць лёгка ламацца і з цяжкасцю зрастацца.

ЗНЕШНАСЦЬ. Тлушчавая праслойка пад скурай атрафіруецца, калагену (бялку, які з'яўляецца асноўным будаўнічым матэрыялам для пругкай скуры) становіцца ўсё менш, таму скура становіцца тонкай, маршчыністай і без тонусу.

ІНШЫЯ НЕПРЫЕМНАСЦІ: лішняя вага, галаўныя боль, галавакружэнне, павышаны ціск або ваганні ціску, сэрцабіццё, страта цікавасці да сексуальнага жыцця, сухасць похвы, нетрыманне мачы падчас чхання ці кашлю, недастатковыя або моцныя менструацыі. Апошнія могуць хаваць анамальны матачны крывацёк, прычынай якога бываюць паталогіі маткі (міёма, паліпы, анкалагічныя захворванні) або парушэнні функцый печані, згусальнай сістэмы крыві, прыём некаторых лекаў і іншае.

Звярніцеся да ўрача, калі менструацыі сталі больш моцнымі, са згусткамі; калі месячныя цягнуцца на некалькі дзён даўжэй, чым звычайна; калі яны ідуць нязвыкла часта; калі паміж менструацыямі або пасля сексу з'яўляюцца крывацёкі.

ЛЁГКА ПРАПУСЦІЦЬ

Калі цяжарнасці ў планах няма, неабходна карыстацца сродкамі кантрацэпцыі да надыходу менапаўзы. Адмовіцца ад іх можна не раней, чым праз год пасля апошніх месячных (некаторыя спецыялісты рэкамендуюць два гады).

НЕ ЗАБЫВАЙЦЕСЯ

1. Раз на год неабходна наведваць гінеколага.

2. Мамаграфія, ультрагукавое даследаванне органаў малога таза, кальпаскапія робяцца з перыядычнасцю, рэкамендаванай урачом.

3. Трэба таксама здаваць аналізы крыві — агульны і біяхімічны (халестэрын, трыгліцэрыды, ліпапратэіды высокай і нізкай шчыльнасці, кальцый, фосфар, шчолачная фасфатаза). Рабіце электракардыяграму. Правярайце згусальнасць крыві (каагулаграма). Пры парушэнні тлушчавага абмену трэба здаць кроў на гармоны шчытападобнай залозы ■

ПАЛЯПШАЕМ САМААДЧУВАННЕ

✓ Рэгулярна займайцеся спортам (4-5 разоў на тыдні).

✓ Не курыце.

✓ Высыпайцеся. Нават па выхадных трэба класціся і ўставаць у адзін і той жа час — так вы не парушыце рэжым сну і не прыйдзеце аднойчы да бяссонніцы.

✓ У рацыёне павінна быць дастатковая колькасць прадуктаў, якія забяспечаць паступленне таго ж кальцыю.

✓ Спытайце ва ўрача, якія мультывітаміны вам можна ўжываць; якія фізічныя нагрузкі будуць аптымальнымі; чым можна карыстацца пры сухасці похвы.

■ Псіхалогія для ўсіх

НАВОШТА ДЗІЦЯЦІ АСАБІСТАЯ ПРАСТОРА?

У кожнага з нас ёсць патрэба ў асабістай прасторы, куды ніхто не заявіцца без запрашэння, дзе мы адчуваем бяспеку і належым толькі самім сабе. І дрэнна, калі дарослыя не ўсведамляюць неабходнасці паважаць асабістую прастору дзіцяці.

— Мы прыходзім у гэты свет у адзіночку і ў адзіночку пакідаем яго, — расказвае **псіхолаг Цэнтра дружалюбнага стаўлення да падлеткаў «Поспех» Кацярына БЛІЗНЮК.** — Наш уласны свет пачынаецца з канкрэтнага «пункту» — з мамы, яе цела. Гэтая прастора — асабістая, непарушная, надзейная — і захоўваецца ў нашай памяці. Паступова мы пачынаем знаёміцца з навакольлем, пашыраем межы свайго свету і займаемся мы гэтым вельмі актыўна, часам нават адчайна. Аднак у нейкі момант узнікае неабходнасць вярнуцца (не літаральна, вядома), каб «пераварыць» свае ўражанні, зазірнуць унутр сябе. У чалавека, які становіцца дарослым, патрэба ў асаблівай прасторы асабліва вострая.

Калі нам фізічна дрэнна — ад болю, удару — мы прымаем позу эмбрыёна, як у пачатку нашага шляху. Па сутнасці, калі нам дрэнна эмацыянальна, мы робім тое ж самае. Нябачная асабістая прастора існуе заўсёды, нават этыкет гэта прызнае і лічыць непрыстойным набліжацца да чалавека надта блізка. Гэта прастора ў псіхалогіі мае назву зоны інтымных стасункаў — той, што займае паўметра ў радыусе непасрэдна ад цела. Калі ў яе ўрываюцца незнаёмыя, мы адчуваем дыскамфорт. Гэта энергетычная асабістая прастора заўсёды з намі і сцеражэ наша цела інстынктыўна.

Натуральнай патрэбай чалавека можна лічыць жаданне крыху пашырыць сваю асабістую зону ў незнаёмым месцы — прынесці туды часцінку свайго дому, што дадае нам упэўненасці і спакою, абароненасці і гармоніі. Так, мы бачым на рабочых сталах некаторых людзей фота блізкіх, фірменныя кубкі, нейкія дробязі... Любімая цацка, узятая малым у дзіцячы садок, або маленькі пупс у кішэні школьніцы — гэта рэчы, патрэбныя дзецям як паветра. Бо гэта таксама асабістая прастора, з якой нельга не лічыцца.

Нябачная асабістая прастора існуе заўсёды, нават этыкет гэта прызнае і лічыць непрыстойным набліжацца да чалавека надта блізка.

У залежнасці ад тыпу тэмпераменту мы ўсе дзелімся на экстравертаў і інтравертаў. І калі для экстраверта ўсё — у размовах, кантактах, то інтраверту абавязкова неабходна пабыць сам-насам з сабой, паразважаць. Для інтраверта час у адзіноце — адна з галоўных крыніц яго энергіі. І вельмі важна, каб у такога дзіцяці была свая прастора, іначай яно можа стаць агрэсіўным і праблемным.

Часам мы арганізуем прастору свайго дома так, што яна належыць усім і нікому. Кожны можа ў любы момант з'явіцца ў любым месцы. Узнікае напружанне. Бо надта шмат непрадказальных кантактаў — заўсёды трэба быць гатовым адказаць на пытанне, выканаць просьбу. Аднак можна і дамовіцца, каб у кожнага была свая асабістая тэрыторыя, хоць бы невялічкая. Асабістая тэрыторыя і асабістыя рэчы. Напрыклад, бацькаў ложак, мамін стол...

Ідэальна, калі ў дзіцяці ёсць свой пакой, аднак няхай гэта будзе хаця б куток, уладкаваны на свой густ. Не варта дабівацца ад дзіцяці пастаяннай, няспыннай занятасці. Гультайніцтва можа аказацца момантам перапрацоўкі атрыманай інфармацыі — для пабудовы карціны свайго ўласнага свету. Турбавацца трэба, хіба калі дзіця суткамі сядзіць у сваім пакоі і не кантактуе з равеснікамі.

Вядома, усе рэчы для дзіцяці набываем мы, дарослыя, але не трэба станавіцца іх абсалютнымі гаспадарамі. **У дзіцяці абавязкова павінны быць рэчы, якія можна зламаць, падарыць, згубіць, і яму за гэта нічога не будзе.** Так можна ўсвядоміць, што такое нечым распараджацца і несці пасля за гэта адказнасць.

Не трэба браць без дазволу дзіцячыя рэчы або даваць іх іншым дзецям. Дзіця ўсвядоміць, што ўсё навокал агульнае, і не будзе лічыцца з чужой уласнасцю.

Калі асабістая прастора парушаецца, гэта можа выклікаць агрэсію, замкнёнасць, раздражняльнасць. І з узростам эмоцыі будуць больш выяўленымі. А ўсё таму, што такое парушэнне закранае пачуццё ўласнай годнасці і сведчыць пра адсутнасць даверу і павагі.

Калі мы забяспечым дзіцяці сваю тэрыторыю і свае рэчы, то вырасцім чалавека з добрай самаацэнкай, адказнага і самастойнага. Імкніцеся разумець, што патрэбна дзіцяці ў той ці іншы момант, і не толькі ў матэрыяльным сэнсе, адказвайце на яго пытанні і фарміруйце пазітыўнае стаўленне да сваёй і чужой уласнасці, да сваіх і чужых пачуццяў ■

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

алімпіец
ЗВЯЗДА
ВЫПУСК № 9 (30)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАЛАРЫТ — У ЭМБЛЕМУ!

ХАКЕЙНАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ ПРЭЗЕНТАВАЛА МАГЧЫМЫ ВАРЫЯНТ УЛАСНАГА ЛАГАТЫПА

Фота pressball.by.

У лагатыпе выкарыстаны элементы нацыянальнага арнаменту, што, на думку кіраўніцтва федэрацыі, павінна вылучаць зборную Беларусі сярод іншых камандаў свету. Таксама ў графіцы прысутнічаюць дзве скрыжаваныя клюшкі і шайба.

«Мы праводзілі адкрыты конкурс на стварэнне лагатыпа асацыяцыі, — распавёў **генеральны сакратар федэрацыі Яраслаў ЗАЎГАРОДНІ.** — Атрымалі каля дваццаці васьмі варыянтаў ад аматараў хакея. Аднак журы конкурсу не змагло выявіць пераможца. Таму федэрацыя была вымушана звярнуцца да трох прафесійных кампаній, якія прапанавалі на выбар каля шасці прынцыпова розных канцэпцый. Мы спынілі свой выбар на гэтай. Асноўнымі крытэрыямі былі лаканічнасць, абавязкова прысутнасць беларускага арнаменту як унікальнага элемента ў хакейным свеце, паколькі з усіх краін — удзельніц сусветнай федэрацыі хакея — у нас адзіных ёсць такі. Плюс, натуральна, хакейная тэматыка. Гэты варыянт яшчэ не канчатковы. Мы адкрыты для прапаноў і пажаданняў. Тым не менш наша задача — паехаць на будучы чэмпіянат свету ўжо з новай сімволікай».

Прапанаваная канцэпцыя будзе абмяркоўвацца цягам месяца, пасля чаго будзе зацверджаны канчатковы варыянт лагатыпа. За гэты тэрмін могуць быць зменены некаторыя дэталі малюнка.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Лакальныя радасці

Вялікія перамогі беларускіх спартсменаў на маленькіх турнірах

1. Меліціна Станюта стала пераможцай міжнароднага турніру па мастацкай гімнастыцы «Baltic Hoop 2015», які праходзіў у Рызе. Беларуская грацыя набрала 69,650 бала і заняла першае месца ў алімпійскай дысцыпліне — шматбор'і. Серабро заваявала расіянка Ірына Аненкава (69,517), тройку прызёраў замкнула гімнастка з Азербайджана Гулсум Шафізада (66,567). Яшчэ адна беларуская гімнастка, Кацярына Галкіна, з вынікам 63,633 заняла сёмае месца.

Паралельна з гэтым традыцыйным турнірам праходзіў Кубак памяці Людмілы Качкалды, у якім удзельнічалі юніёркі ў групавых практыкаваннях. З вынікам 31.400 балаў беларуская каманда атрымала ўпэўненую перамогу. На другім месцы расійскія гімнастки, бронзу заваявалі гаспадыні турніру — каманда Латвіі.

2. Беларуская фрыстайлістка Аляксандра Раманоўская заняла трэцяе месца на этапе Кубка Еўропы ў Швейцарыі. У фінале выступала яшчэ адна беларуска, Вера Ляшкевіч, якая заняла 5-е месца. Пераможцай жа стала расіянка Любоў Нікіціна.

Нагадаем, што ў гэтым сезоне да васямнаццацігадовай Аляксандры Раманоўскай прыйшлі першыя вялікія перамогі. Так, у канцы студзеня беларуска нечакана для заўзятараў і спецыялістаў перамагла на адным з этапаў Кубка свету ў амерыканскім Лэйк-Плэсідзе. Аднак пасля атрымала траўму і прапусціла фінальны этап Кубка свету ў Раўбічах. У агульным заліку Кубка свету яна заняла 9-е месца, а ў генеральнай класіфікацыі Кубка Еўропы ідзе на чацвёртым месцы.

3. З трыма медалямі вяртаюцца нашы баксёры з маладзёжнага турніру, прысвечанага памяці савецкага спартсмена Дана Пазняка. У спаборніцтвах, якія праходзілі ў Вільнюсе, удзельнічалі больш за сто перспектыўных юных атлетаў з Аўстрыі, Беларусі, Венгрыі, Даніі, Ізраіля, Кіпра, Нідэрландаў, Нарвегіі, Францыі, Чэхіі і іншых краін.

Перамогу ў вагавай катэгорыі да 75 кг святкаваў Антон Стэльмакоў, які ў фінальным паядынку выйграў у ўзбекскага баксёра Казімбека Мардонава. Маглі паўтарыць дасягненне суайчынніка двое яго калег па камандзе, аднак хлопцы саступілі ў вырашальных сустрэчах. Такім чынам, Яўген Кармільчык і Мікалай Шах засталіся з «серабром».

4. У алімпійскім спарткомплексе «Стайкі» **завяршыўся розыгрыш Кубка Беларусі па цяжкай атлетыцы, на якім устаноўлены тры рэкорды краіны.** У жанчын прадстаўніца Лельчыц Алена Ляхавец у рыўку падняла штангу вагой 73 кг, абнавіўшы тым самым нацыянальны рэкорд. Спартсменка з Гомельскай вобласці выйграла турнір з сумай 159 кг.



Бронзавы прызёр Алімпіяды-2008 у Пекіне Настасся НОВІКАВА заняла першае месца ў катэгорыі да 63 кг. Вынік лідара жаночай зборнай — 223 кг. Іншыя лідары жаночай каманды таксама паказалі высокія вынікі. Дар'я Пачобут (да 69 кг) стала першай з вынікам 245 кг, Дзіне Сазанавец не было роўных у катэгорыі да 75 кг.

У мужчын фенаменальна выступіў Яўген Жарнасек (звыш 105 кг). Беларускі суперцяж пераадолеў на Кубку Беларусі грасмайстарскую адзнаку ў 410 кг па суме дваябор'я і выйграў турнір.

Акрамя гэтага, пераможцам Кубка Беларусі з двума рэкордамі сярод юніёраў (у рыўку і суме дваябор'я) у катэгорыі да 69 кг стаў Арцём Крокаў. Адзначым, што Кубак Беларусі — важны этап падрыхтоўкі да чэмпіянату Еўропы па цяжкай атлетыцы, які з 10 па 18 красавіка пройдзе ў Тбілісі.

5. У заключны дзень Кубка Еўропы па лёгкаатлетычных кіданнях, які праходзіў у партугальскай Лейрыі, **беларускія атлеты выйгралі дзве ўзнагароды,** папоўніўшы сваю скарбонку да пяці медалёў.

У дзяўчат (да 23 гадоў) першае месца ў кіданні молата заняла Алена Собалева. У гэтай жа ўзроставай групе «бронзу» ў кіданні кап'я заваяваў беларус Аляксандр Казлоўскі.

Па выніках Кубка Еўропы па лёгкаатлетычных кіданнях у актыве зборнай Беларусі пяць узнагарод рознай вартасці. Узгадаем таксама «золата» Юліі Леанцюк (штурханне ядра), серабро «малатабойца» Юрыя Васільчанка і «бронзу» Вікторыі Колб (штурханне ядра).

Навіны збірала Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Фота Надзеі БУЖАН.

Дзяніс ОСІПАЎ — апошні з магікан зборнай Беларусі па фрыстайле. Ён выступаў за нацыянальную каманду поплеч са славутымі Аляксеем Грышыным, Дзмітрыем Дашчынскім, Антонам Кушнірам і Алай Цупер. Летам яму споўніцца 32, і ён самы вопытны спартсмен у зборнай. Праўда, Дзяніс у пашпарт не глядзіць і кар'еру завяршаць не плануе. Нядаўна заваяваў «бронзу» ў акрабатыцы на этапе Кубка свету ў Раўбічах і збіраецца пазмагацца за ўдзел у зімовай Алімпіядзе, якую праз тры гады прыме карэйскі Пхёнчхан. А пакуль ёсць вольная хвіліна, дае змястоўнае інтэрв'ю карэспандэнту «Звязды».

ПАЛЁТ ОСІПАВА

Беларускія фрыстайлісты разлічваюць трымаць узятую вышыню

— Для мяне падобная ўзнагарода значыць многае, — прызнаецца Дзяніс. — І, па вялікім рахунку, хатні этап Кубка свету быў, як Алімпійскія гульні: не хацелася ўдарыць тварам у гразь, было вялікае жаданне заняць прызавое месца. І я рады, што так і атрымалася.

Асабліва перад стартам не хваляваўся. Мяне крыху бянтэжыла надвор'е, але я стараўся не думаць аб ім. На маёй памяці гэта ўжо не першы выпадак, калі з-за ўмоў спаборніцтвы былі пад пагрозай зрыву. На адным з этапаў, на поўначы Канады, перад пачаткам спаборніцтваў адмянілі трэніроўкі. Прыйшлося скакаць без падрыхтоўкі. Слой снегу быў мінімальны. У некаторых месцах з'явіліся лужы і туман. Пайшоў дождж. Праўда, арганізатары выкруціліся і правялі этап на належным узроўні. Адрозненне ад раўбіцкага этапа ў тым, што ў Канадзе ляжаў натуральны снег, а ў нас з-за цёплай зімы ўпор зрабілі на штучны. Апошні этап Кубка свету Раўбічы прымалі тры гады таму. За гэты час шмат што змянілася. У нас з'явіліся новыя трамплiны, абсталявалі судзейскі домік. І цяпер туды пагрэцца могуць зайсці не толькі суддзі, але і спартсмены.

❍ ❍ ❍

Хатні этап Кубка свету ў Раўбічах — гэта нешта сваё, не падобнае да іншых спаборніцтваў. На некаторыя этапы прыходзіць мала гледачоў. А ў нас за скачкамі сачыла шмат балельшчыкаў. Сярод іх, дарэчы, было багата сваякоў фрыстайлістаў. Мяне прыехалі падтрымаць мае сябры і жонка. Прысутнасць іх на трыбунах прыдавала мне ўпэўненасці.

❍ ❍ ❍

— Фрыстайлістам больш камфортна выступаць увечары. У дрэннае надвор'е не так проста прызямліцца. А пры святле пражэктараў вельмі добра відаць на схіле ўсе грудкі. Пры палёце ты арынтуешся на іх і можаш добра выканаць прызямленне.

❍ ❍ ❍

— Спортам пачаў займацца з першага класа. Да нас у школу прыходзілі спецыялісты з розных секцый, гурткоў, глядзелі на фізічныя здольнасці, прасілі, каб падцягнуўся некалькі разоў, адціснуўся, і пакідалі свае візітоўкі. Я назбіраў поўную кішэню гэтых «талонаў» па розных відах спорту. Гімнастыка, акрабатыка, вырашыў паспрабаваць сябе нават у музыцы. Мне, малому, хацелася паўсюль паўдзельнічаць. Але разам з маці спыніліся на гімнастыцы, бо калі трэнер Мікалай Якаўлевіч Котаў завёў мяне на батут, ён мне здаўся нечым касмічным, нерэальным.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

❍ ❍ ❍

— У фрыстайле апынуўся ў 1999 годзе. Дагэтуль я не ведаў нічога пра гэты спорт. У навінах па тэлебачанні неяк глядзеў, як спартсмен выконвае скачок, і быў літаральна шакіраваны ўбачаным. Я ведаў, што такое сальта, што такое вярчэнне, але ніяк не мог зразумець, як гэта ехаць на лыжах, а пасля рабіць адважны скачок з трамплiна. Думаў, гэтыя людзі вар'яты. А ў выніку сам стаў адным з іх.

❍ ❍ ❍

— Фрыстайлісты самі па сабе даволі экстрэмальныя людзі. Цалкам бясстрашным сябе не назаву, але экстрым зацягвае. І ўвесь час хочацца чагосьці новага. Я некалькі разоў скакаў у Гомелі на вяроўцы з моста. А пасля Алімпіяды ў Ванкуверы, дзе перамогу здабыў Лёша Грышын, нашы хлопцы ездзілі на аднаўленчыя зборы на Кубу і скочылі з парашутам. Знаходзіліся ў свабодным падзенні 45 секундаў. Зразумела, рабілася гэта разам з інструктарам, але ўсё роўна было прыемна. Я таксама хачу зрабіць нешта падобнае, аднак не маю пакуль на гэта магчымасці.

Фота Надзеі БУЖАН.

❍ ❍ ❍

— Мой родны Гомель у нечым стаў культавым горадам для беларускага фрыстайла. Менавіта туды з Украіны пераехаў шэраг спартсменаў. Сярод іх былі трэнер Наталля Шарснёва і Ала Цупер. З украінцаў у горадзе ўсё і пачалося. Да іх фрыстайлам там ніхто не займаўся.

❍ ❍ ❍

— Я жыў у Гомелі ў раёне «Сельмаш». І нічога крымінальнага пра яго сказаць не магу. Магчыма, нехта і мае пра яго злачынныя гісторыі, хадзіў туды, куды не трэба было. У маім дзяцінстве спорт займаў увесь час. На астатняе яго не хапала. У нас нават летніх канікул у звычайным разуменні не было.

❍ ❍ ❍

— Атрымліваецца, што я сапраўды «апошні з магікан» у зборнай. Усе хлопцы з былой каманды кар'еру закончылі. Толькі Антон Кушнір на пэўны час узяў тайм-аўт, але плануе аднавіць кар'еру. Усе таварышы па сённяшняй камандзе маладзейшыя за мяне на 5-10 гадоў. Але я не стаўлюся да іх, як да малодшых. У калектыве ўсе размаўляюць на роўных. Кожны мае сваё слова. Атмасфера ў зборнай добрая.

❍ ❍ ❍

— Планую яшчэ як мінімум тры гады выступаць на высокім узроўні. Хочацца прабіцца на Алімпіяду. А тады і пабачым, што будзе далей. У сваёй кар'еры я пакуль толькі аднойчы ўдзельнічаў у Гульнях (у 2014 годзе ў Сочы. — **Аўт.**). Тады перад стартам склалася цікавая сітуацыя. У нашай зборнай было 6 хлопцаў, і толькі 4 з іх маглі трапіць у заяўку на Алімпійскія гульні. Антон Кушнір, Аляксей Грышын і Дзіма Дашчынскі адабраліся па рэйтынгу, а паміж мной і Максімам Гусцікам праходзілі цяжкія, напружаныя спаборніцтвы за апошнюю пуцёўку. У выніку выбралі мяне. Безумоўна, Максім засмуціўся, але нічога, ніякіх крыўдаў няма. Мы кантактуем і цяпер. У камандзе, паўтаруся, пануе шыкоўная атмасфера. А для мяне ўдзел на Алімпіядзе стаў ажыццяўленнем мары. Я доўга ішоў да яе, двойчы не адбіраўся, саступаў месца Цімафею Слiўцу. Дэпрэсіі з-за гэтага ў мяне не было. Ставіўся да падобнага па-філасофску. Прымаў, як ёсць. Значыць, так трэба было.

❍ ❍ ❍

— Поспехі Антона Кушніра і Алы Цупер на Алімпіядзе для мяне нечаканасцю не сталі. Ад Антона я ў любым выпадку чакаў медаль. На той момант ён дэманстраваў проста ідэальныя скачкі. Ад іх вока радавалася! Гэта тычыцца і Алы. На яе таксама ўскладваліся задачы. Бо ўсе ведалі, што яна здольная на добры вынік.

❍ ❍ ❍

— У мяне няма любімых скачкоў. Усе яны аднолькавыя. Проста трэба ставіцца да іх з усёй адказнасцю.

❍ ❍ ❍

— За кароткі адрэзак часу падчас палёту можна абдумаць усё, што заўгодна. Я нават сам задаюся пытаннем, як гэта магчыма? Часам наогул здаецца, што гэтыя некалькі секундаў цягнуцца для цябе ўсе паўгадзіны.

❍ ❍ ❍

— Са сваёй жонкай Сабінай я сустрэўся чатыры гады таму, а праз два гады мы пажаніліся. Яна таксама з Гомеля, але наша знаёмства не мае ніякага дачынення да спорту. Мы пазнаёміліся ў коле сяброў. Па адукацыі яна эканаміст, але яшчэ выкладае ёгу. Праўда, цяпер яна ў адпачынку па доглядзе дзіцяці. Роўна год таму ў нас нарадзіўся сын, якому далі імя Мірон.

❍ ❍ ❍

— Пасля Алімпіяды я стаў зарабляць у два разы менш, і фінансавая сітуацыя пачалася адбівацца на маім жыцці. Ратавалі пастаянныя зборы і раз'езды, якія дазвалялі эканоміць. Заробак амаль цалкам ішоў на аплату арэнды кватэры. Але дзякуй гаспадыні, у якой мы здымаем жытло. Яна разумее агульнае становішча і бярэ з нас разумныя грошы.

❍ ❍ ❍

— Люблю вудзіць рыбу. Любую. Галоўнае, каб яна добра бралася. А ўсё пачалося з дзяцінства, калі мяне да гэтага прывучыў дзядуля. Я даволі актыўна рыбачыў на зборах. Разам з Максімам Гусцікам пастаянна вудзілі рыбу ў Швейцарыі. Лавілі ўсё: і плотку, і ляшча, і акуня...Часам нават смажылі, але найчасцей адпускалі ўлоў назад у вадаём. Між іншым, большасць людзей вудзяць там выключна дзеля спартыўнага інтарэсу, дзеля расслаблення.

❍ ❍ ❍

— Беларусь у фрыстайле — адна з самых перспектыўных і паспяховых краін. У медальным заліку ў сусветным рэйтынгу, калі не памыляюся, мы займаем другое месца. Унікальны цэнтр фрыстайла, які павінны неўзабаве адкрыць у Мінску, палепшыць нашу падрыхтоўку скачкоў, якасць выканання.

— Ён з'явіўся своечасова?

— Безумоўна, было б лепш, каб ён з'явіўся ў нас раней. Мы б толькі лепш падрыхтавалі праграму. Галоўнае, што завяршылі будаўніцтва, распачатае пасля Алімпіяды ў Ванкуверы ў 2010 годзе.

❍ ❍ ❍

— Мне ніколі не прапаноўвалі пераехаць і выступаць за іншую краіну. Але мне гэтага і не трэба. Мне за нашу зборную прыемна выступаць.

Тарас ШЧЫРЫ.

ГАТОЎНАСЦЬ НУМАР АДЗІН

ДАВЕДКА

Беларуская федэрацыя футзала створана ў 1993 годзе і з таго ж часу з'яўляецца членам Еўрапейскага саюза футзала, удзельнічае ў кантынентальных чэмпіянатах.

Беларусь і раней праводзіла розныя турніры па футзале еўрапейскага ўзроўню. Напрыклад, дзясяты чэмпіянат Еўропы сярод мужчынскіх камандаў у 2012 годзе прымаў Брэст, а ў Гомелі ў 2013-м адбыўся турнір Лігі чэмпіёнаў.

Зборная Беларусі па футзале дамаглася гучнага поспеху, стаўшы чэмпіёнам Еўропы 2014 года. У вырашальным паядынку 11-га кантынентальнага першынства, які праходзіў у Празе (Чэхія), беларусы выйгралі ў зборнай Бельгіі з лікам 2:1. На шляху да фінальнага матча яны перамаглі футбалістаў Славакіі і Бельгіі ў серыях пасляматчавых пенальці, а таксама Нарвегію ў дадатковы час. У паўфінальным матчы беларускія спартсмены ўзялі верх над каталонскай камандай з лікам 2:0.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што тычыцца гульцоў, то з кастрычніка ўсе кандыдаты ў зборную Беларусі знаходзяцца пад кантролем трэнерскага штаба. Падрыхтоўка складалася з некалькіх этапаў, першым з якіх сталі афіцыйныя рэспубліканскія спаборніцтвы, а дакладней — чэмпіянат Беларусі і 20-ы розыгрыш Кубка краіны. Усе гульцы зборнай прайшлі медыцынскія абследаванні, стан іх кантралюецца. Таксама мы правялі першыя вучэбна-трэніровачныя зборы ў Раўбічах, яны доўжыліся пяць дзён, і за гэты час трэнерскі штаб атрымаў дастаткова патрэбнай інфармацыі для аналізу як фізічнага стану гульцоў, так і іх практычнай падрыхтоўкі.

У лютым зборная паспяхова правяла два спарынгі са сталічнымі клубамі, якія скончыліся ўдала для нас. Цяпер гульцоў чакае 6-ы тур чэмпіянату краіны ў Брэсце, дзе мы плануем яшчэ раз прагледзець усіх кандыдатаў у зборную. Далей запланаваны зборы ў Мінску, яны пройдуць з 7 па 17 красавіка. Будзем трэніравацца ў «Мінск-Арэне». У трэніровачнай зале ўжо накрылі спецыяльны насціл, які нам неабходны. Там пройдзе і стартавая гульня з бразільцамі, і, спадзяюся, паўфінал і фінал з удзелам беларусаў.

Гэтыя апошнія зборы дадуць нам канчатковую інфармацыю і магчымасць выбраць з 17-ці гульцоў тых 12, якія будуць заяўлены на чэмпіянат свету. Трэнерская каманда ўжо вызначана, мне дапамагаюць два спецыялісты — гэта Ігар Шыла і Леанід Коўш. Таксама мы заручыліся падтрымкай практычна ўсіх кіраўнікоў структур, у якіх працуюць нашы гульцы. Усе яны гатовыя адпускаць спартсменаў для паўнавартаснай, якаснай падрыхтоўкі і паважліва ставяцца да той задачы, якая пастаўлена перад зборнай Беларусі. А задача адна — медалі.

— Па выніках лёсавання чэмпіянату, зборная Беларусі трапіла ў групу з камандамі Бразіліі, Уругвая і Аўстраліі. Што скажаце пра сапернікаў і якія шанцы нашых футзалістаў?

— Гэта вельмі няпростая група. У футзальным плане гэтыя краіны шмат чаго дамагліся. Бразільцы — неаднаразовыя чэмпіёны свету, уругвайцы — шматразовыя прызёры чэмпіянатаў свету і свайго кантынента. Таму будзе няпроста, але гэта нас абсалютна не палохае, мы гатовы да таго, каб гуляць з усімі камандамі, таму што задачы пастаўлены высокія. Па выніках лёсавання яны абсалютна ніяк не карэктаваліся. Акрамя таго, што ў нас няпростая група, сама «галіна» чэмпіянату вельмі складаная. Калі глядзець тэарэтычна, выходзячы з групы, мы трапляем зноў жа на вельмі сур'ёзнага саперніка, а далей, у паўфінале нас, хутчэй за ўсё, чакае чэмпіён свету — Калумбія.

— У Мінску буйныя спартыўныя спаборніцтвы праводзіліся ўжо не раз, праблем з арганізацыяй чэмпіянату менш, чым у рэгіёнах?

— Як ні дзіўна, менавіта ў рэгіёнах усё значна прасцей, больш эфектыўна спрацоўвае адміністрацыйны рэсурс. Усё знаходзіцца ў поўнай баявой гатоўнасці. Мы неаднаразова выязджалі на гэтыя аб'екты, праводзілі цэлы шэраг мерапрыемстваў. За Пінск і Брэст я абсалютна спакойны, людзі там вельмі актыўныя, ініцыятыўныя, ва ўсіх пытаннях правядзення чэмпіянату гатовыя праяўляць свой рэсурс, свае магчымасці. У Барысаве і Маладзечне былі зусім нядаўна, усе пытанні прапрацаваны. У тым, што і там будзе ўсё на найвышэйшым узроўні, я абсалютна ўпэўнены. І балельшчыкаў, і кіраўніцтва гэтых гарадоў засмучае толькі адно — там будзе праведзена мала матчаў. У Маладзечне — дзве гульні, у Барысаве — усяго адна. А яны хацелі б прыняць больш.

Асноўныя складанасці сканцэнтраваны якраз у Мінску. Па-першае, таму што тут дзве групы камандаў. Па-другое, яны гуляюць на такіх сур'ёзных аб'ектах, як «Мінск-Арэна» і Палац спорту, таму тут у нас яшчэ ёсць некаторыя пытанні, якія трэба паспець дапрацаваць. Магчыма, узмацніць вонкавую рэкламу, больш актыўна запусціць на экраны анонсы чэмпіянату.

Існуе яшчэ адна праблема, якая пакуль не вырашана, — гэта трансляцыі матчаў з Пінска і Брэста. Гэта тое, у чым раней мы былі абсалютна ўпэўнены, бо пытанне было пазначана з першага дня падрыхтоўкі да чэмпіянату свету, аднак цяпер паўсталі пэўныя тэхнічныя складанасці. Па нашай папярэдняй дамоўленасці павінна была ажыццяўляцца тэлетрансляцыя 29-ці матчаў першынства. Тым больш што ў Пінску згуляюць зборныя Расіі і Аргенціны, на матчы якіх ужо няма квіткоў. У Брэсце выступяць чэмпіёны свету калумбійцы і адна з наймацнейшых зборных свету — Венесуэла. Трансляцыі ў любым выпадку павінны быць арганізаваны.

— Да чэмпіянату застаўся месяц, наколькі высокую цікавасць праяўляюць заўзятары?

— Калі казаць пра замежных турыстаў, то ўжо вядома, што многія дэлегацыі прывязуць групы сваіх прыхільнікаў. Пакуль дакладную лічбу назваць складана. Ведаю, што прыедуць аматары спорту з Аргенціны. Яны нават будуць праводзіць тут шэраг мерапрыемстваў, бо прэтэндуюць на правядзенне чэмпіянату свету па футзале ў 2019 годзе. Чакаем, вядома, што будзе шмат расіян.

Што да беларусаў, то іх цікавасць расце з кожным днём. Цэны на квіткі ў нас першапачаткова былі сацыяльна арыентаваныя. У дзень будзе праходзіць па дзве гульні на арэне, таму квіток прадаецца адразу на два матчы. Кошт білета на першы этап ад 60 тыс. рублёў. Таксама прадаюцца абанементы, распрацавана сістэма зніжак. На сувенірную прадукцыю цэны таксама досыць дэмакратычныя, «сувенірка» будзе рэалізоўвацца ва ўсіх гарадах, дзе пройдуць гульні чэмпіянату.

— Заўзятарам футзала ўласцівы такі ж буйны нораў, як і фанатам «вялікага» футбола?

— Не, у футзале глядач больш дысцыплінаваны, у нас няма груп, якія ствараюць непатрэбнае напружанне, ладзяць бойкі. За ўсю сваю трэнерскую працу, за 25 гадоў, я ні разу не сустракаўся з падобнага роду канфліктамі. Спадзяюся, што і на чэмпіянаце свету ў Мінску нічога падобнага адбывацца не будзе. Я лічу, што наш спорт больш яркі, больш дынамічны, чым футбол, дзе больш паўзаў. Дынаміка футзала ў 5 разоў вышэйшая за футбольную, усё гэта прываблівае гледачоў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Група А
(гульні пройдуць у Мінску і Маладзечне)
— Аўстралія
— Беларусь
— Бразілія
— Уругвай

Група В
(гульні пройдуць у Мінску, Маладзечне і Барысаве)
— Бельгія
— Марока
— Нарвегія
— Парагвай

Група С
(гульні пройдуць у Брэсце)
— Венесуэла
— Калумбія
— Кюрасаа
— Чэхія

Група D
(гульні пройдуць у Пінску)
— Аргенціна
— Кыргызстан
— Расія
— Славакія

Чвэрцьфіналы ў групе С і D адбудуцца ў Брэсце, у групе А і В у Мінску.

Паўфінальныя матчы, фінал і гульня за 3-е месца пройдуць на «Мінск-Арэне».

Многоквартирный жилой дом по пер. Инструментальному, 11а

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

УП «КАНИМИС» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства

ЗАСТРОЙЩИК – ЧТУП «КАНИМИС»

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 3 апреля 2003 года №505, в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100856965.

Юридический адрес: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 27, корп. 2, к. 28.

Почтовый адрес: г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, к. 1, телефон/факс +37517 306 08 02, +37517 306 07 81, режим работы: понедельник–пятница: с 9.00 до 18.00; выходные дни – суббота, воскресенье, обед с 13.00 до 14.00.

Ранее реализованные проекты: Многоквартирный жилой по адресу: г. Минск, ул. Школьная, д. 16, введен в эксплуатацию в декабре 2014 года.

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по договору № 452-Д на реализацию права проектирования и строительства объекта «Многоквартирный жилой дом по пер. Инструментальному, 11а» от 21.12.2012 г. с Минским городским исполнительным комитетом.

Объект строительства – Многоквартирный жилой дом по пер. Инструментальному, 11а.

Нормативная продолжительность строительства Объекта – 12,2 мес., ввод в эксплуатацию – III квартал 2015 года.

Застройщиком получены:

- Решение Мингорисполкома от 22 августа 2013 года №2081.

- Свидетельство (удостоверение) №500/973-2252 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) на него, свидетельство (удостоверение) №500/973-2253 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав, ограничений (обременений) на него, расположенных по адресу: г. Минск, пер. Инструментальный, 11а.

- Экспертное заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗЫ» от 14.06.2013 года №05-03/4269;

- Разрешение Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску №2-206Ж-045/13 от 04.03.2015 г.

Договор строительного подряда № 09/09.2013 от 09.09.2013 г. с ООО «СК-12».

Жилой дом расположен в Первомайском районе г. Минска по пер. Инструментальному, 11а на 70 квартир – односекционный, двенадцатиэтажный, с подземным гаражом-стоянкой на 35 машино-мест, запроектирован с теплым чердаком, плоской кровлей, с двумя пассажирскими лифтами. Вентиляция в квартирах – естественная. Конструктивная схема зданий – монолитный каркас с заполнением горизонтальным кирпичом. Наружная отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

Сведения о благоустройстве: Озеленение, устройство дорожных покрытий, благоустройство прилегающей территории.

Этажность – 12. Площадь жилого здания – 5583,60 кв.м. Общая площадь квартир – 4604,18 кв.м. Общая площадь гаража-стоянки 1037,66 кв.м.

Всего в доме – 70 квартир, из них для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства дольщиков – **граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров долевого строительства**:

Однокомнатных общей площадью от 44,76 до 46,04 кв.м – 2 квартиры. Цена 1 кв.м – 31 160 000 руб.

Двухкомнатных общей площадью от 65,35 до 65,84 кв.м – 1 квартира. Цена 1 кв.м – 31 160 000 руб.

Трехкомнатные общей площадью от 84,57 до 84,99 кв.м – 2 квартиры. Цена 1 кв.м – 31 160 000 руб.

Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков:

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, ненесущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию зданий.

Информацию по объекту долевого строительства и условиями заключения договоров можно получить в офисе УП «КАНИМИС» по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 10 – 1А. Телефон/факс: 8(017) 306 08 02, 8(017) 306 07 81 с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни: суббота, воскресенье.

Центр Транспортной Оценки

Закрытое акционерное общество «Центр транспортной оценки»

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Продавец:	**ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4»,** г. Барановичи, ул. Тельмана, 100. Тел./факс: (0163) 48-88-12, 48-87-89.
Организатор аукциона:	**ЗАО «Центр транспортной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703. Тел.: (+375 17) 268-05-70; 029-183-69-71.
Предмет аукциона:	Капитальное строение с инвентарным номером: 110/С-106224, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Тельмана, 100Е, общей площадью 9,7 кв.м. Наименование: контрольно-пропускной пункт. Назначение: Здание специализированное автомобильного транспорта. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание контрольно-пропускного пункта с бетонным крыльцом, асфальтным покрытием территории пл. 7141 кв.м и забором ограждения протяженностью 45м.
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер: 141000000001003001. Адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Тельмана, 100Е. Площадь (га): 0.9149. Категория: Земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов. Целевое назначение: обслуживание контрольно-пропускного пункта с автостоянкой. Земельный участок предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранная зона ЛЭП, площадь 0.0354 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0.0759 га.
Начальная цена с НДС 20%	**576 000 000 белорусских рублей.**
Условие аукциона	Обеспечение беспрепятственного доступа обслуживающих организации и представителей продавца к сетям и сооружениям канализации, очистным сооружениям, ЛЭП, для их обслуживания и ремонта. Покупатель обязан установить ж/б забор (h не менее 2 м), по границам земельного участка смежного с земельным участком ОАО «ГАП-4» г. Барановичи в течение 30 календарных дней после подписания акта приема-передачи предмета аукциона.

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012 344 930 017; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на следующие счета: в евро (EUR) – 3012 344 935 025; в долларах США (USD) – 3012 344 935 012; в российских рублях (RUB) – 3012 344 935 038 - в ЦБУ № 507 гор. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191284787, получатель платежа: ЗАО «Центр транспортной оценки».

Срок подписания договора купли продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты: Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** с даты подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.ctocenka.by**, а также на сайте **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **22.04.2015 в 14.00** по адресу: г. Барановичи, ул. Тельмана, 100, актовый зал, Открытое акционерное общество «Грузовой автомобильный парк № 4» г. Барановичи.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.04.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. ЗАО «Центр транспортной оценки».

Тел.: (+375 17) 268-05-70; 8029-183-69-71.
E-mail: auction@cpo.by; auction@ctocenka.by.

СООО «ВильнюсСтрой»

Учетный номер плательщика: **191434087.** Вид экономической деятельности: **Подготовка к продаже недвижимого имущества (70110).**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220039, Минск, ул. Воронянского, 7а, 1-й этаж, каб. 60.**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2014 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	25	8
Нематериальные активы	120	-	-
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	9	9
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**34**	**17**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	1 119	4 452
В том числе:			
материалы	211	10	4
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	1 109	4 448
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	32 580	
Расходы будущих периодов	230	2 588	16 087
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	270	61
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	14 932	1 726
Краткосрочные финансовые вложения	260	63	352
Денежные средства и их эквиваленты	270	10 167	141
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**61 719**	**22 819**
БАЛАНС	**300**	**61 753**	**22 836**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	190	190
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	(129)
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	133	107
Добавочный капитал	450	1	-
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	1 524	682
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**1 848**	**850**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	33 671	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	23 300	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**56 971**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	267	19 939
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	2 667	2 047
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	2 501	1 790
по авансам полученным	632	15	142
по налогам и сборам	633	34	24
по социальному страхованию и обеспечению	634	14	10
по оплате труда	635	45	23
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	58	58
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650		-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**2 934**	**21 986**
БАЛАНС	**700**	**61 753**	**22 836**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2014 года	За январь–декабрь 2013 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	1 852	-
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(920)	-
Валовая прибыль (010 – 020)	030	932	-
Управленческие расходы	040	-	-
Расходы на реализацию	050	(14)	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	918	-
Прочие доходы по текущей деятельности	070	119	-
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(191)	(29)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	846	(29)
Доходы по инвестиционной деятельности	100	191	947
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	-	-
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	191	947
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	-	-
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	-	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	167	-
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	11	-
прочие доходы по финансовой деятельности	122	156	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(156)	-
В том числе:			
проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	-	-
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(156)	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130)	140	202	947
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	1 048	918
Налог на прибыль	160	(200)	(170)
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(6)	-
Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200)	210	842	748
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	1	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	843	748
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель

Главный бухгалтер

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
	ЛОТ 1
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 440/С-11644 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – рынок), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Первомайская, рынок. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие (площадью 3678 кв.м), крытые столы (2 шт.), туалет блочный, калитка металлическая (4 шт.), ворота металлические (2 шт.), забор ж/б (длина 239,89 м.)
Земельный участок	Кадастровый номер 424950100001002619, площадью 0,3932 га, (назначение – размещение коммерческих, оздоровительных, культурных, торговых, бытовых объектов) по адресу: г. Ошмяны, ул. Первомайская, б/н. Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код -1,1, площадью – 0,3932.
Начальная цена продажи	1 126 536 000 (один миллиард сто двадцать шесть миллионов пятьсот тридцать шесть тысяч) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	56 326 800 (пятьдесят шесть миллионов триста двадцать шесть тысяч восемьсот) белорусских рублей
Продавец	Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, 8-01593-4-44-84
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32
Условия аукциона	Сохранение рынка и проведение его реконструкции
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225

Аукцион состоится 31 марта 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь*: заверенная копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица и заверенные копии учредительных документов;

- *индивидуальным предпринимателем*: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, до продажи объекта в процессе аукционных торгов, без объяснения причины.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первых торгов было размещено в газете «Звязда» от 13.06.2014 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).

Последний день приема заявлений 27 марта 2015 г. до 15.00.

Телефон для справок: 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

Дополнительная информация: www.ino.by

Извещение о проведении 22 апреля 2015 г. аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для строительства магазина в Брестском районе

№ лота	Местоположение земельного участка	Площадь, га	Стоимость, руб.	Целевое назначение земельного участка, его кадастровый номер, ограничения в использовании земель, срок аренды
1	**аг. Большие Мотыкалы**	0,0500		Строительство магазина № 121200000001002212 срок аренды 50 лет
	Начальная (стартовая) стоимость		9336640	
	сумма задатка		1000000	
	расходы на изготовление земельно-кадастровой документации		1949163	
	расходы на организацию и проведение аукциона		Согласно акта выполненных работ	

Аукцион будет проводиться 22.04.2015 г. в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. В. Хоружей, 2 (здание райисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать: заявление об участии в аукционе; копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет финансового отдела Брестского райисполкома № 3602213000245 филиал № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 200035889, код платежа 04002, залога в размере 10% от начальной цены земельного участка; копию свидетельства о государственной регистрации юридического лица, индивидуального предпринимателя.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. В. Хоружей, 2, каб. 52 (здание райисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений – **14 апреля 2015 года до 17.00.**

Контактные телефоны: 213634, 213640.

ООО «БЕЛИНВЕСТОЦЕНКА»
извещает о проведении повторного открытого аукциона ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ СТОЛОВОЙ С ОБОРУДОВАНИЕМ ОАО «Кричевцементношифер»
Начальная цена снижена на 20%.

Лот № 1. Здание столовой с ограждением, проездами, площадками, оборудованием столовой (82 единицы), расположенные по адресу: г. Кричев, ул. Зеленая, 4
Характеристика объектов: Здание столовой (инв. № 00110080, рег. № в ЕГРНИ 730/С-181, двухэтажное кирпичное здание, 1981 г., общая площадь 1379 кв.м, имеются все коммуникации), ограждение декоративное металлическое (инв. № 00220159, длина 38 м), ограждение ж/б (инв. № 220082-1, рег. № в ЕГРНИ 730/С-13334, длина 40 м), ограждение кирпичное (инв. № 00220082, оштукатурено, длина 24,1 м), ограждение декоративное ж/б (инв. № 00220158, длина 105 м), проезды и площадки асфальтобетонные (инв. № 00220161), тротуары бетонные (инв. № 00220160), торговое оборудование в количестве 82 единиц: витрина холодильная (инв. № 00444234), 3 витрины холодильные ВХС-1М (инв. № 00440801-00440803), водонагреватель SGHP100 (инв. № 00444235), 3 кондиционера (инв. №№ 00444142, 00444144, 00444145), кондиционер HSU-09HD03/R2 (инв. № 00445194), кондиционер RK-48 ИН/RK-48НМЕ (инв. № 00445353), кондиционер RK-48 ИН/RK-48НМЕ (инв. № 00445352), ларь морозильный CSG 45 (инв. № 00444894), ларь морозильный ELCOLD CSG35 (инв. № 00444338), ларь морозильный FROSTOR F400 (инв. № 00445541), линия-прилавок (инв. № 00440460), лифт ЛТ-100 (инв. № 00440463), лифт ЛТН-100 (инв. № 00440464), машина посудомоечная МПУ-700-01 (инв. № 00445130), морозильник (инв. № 00440847), морозильник «Атлант» (инв. № 00445164), печь ротационная (хлебопечка) (инв. № 00440673), 2 плиты электрические промышл. ПЭМ4-010 (инв. № 00445054,№ 00445058), пожарная сигнализация (инв. № 00640427, № 00640153), система видеонаблюдения (инв. № 00444876, № 00640197), системный блок Cel-950 (инв. № 01340116), системный блок ICS (инв. № 01340131), СПЛИТ KLS 218 (инв. № 00445503), СПЛИТ KLS 220 (инв. № 00445500), СПЛИТ KMS 107 (инв. № 00445501), СПЛИТ KMS 120 (инв. № 00445502), теплосчётчик ТЭМ-05М-1 ду50 (инв. № 00640124), течеискатель LS 790 (инв. № 00640555), холодильник (быт.) (инв. № 00440455), холодильник МХМ 268-00 (инв. № 00444203), 3 холодильника МХМ 2706-00 (инв. № 00440835, №00440836, №00445100), холодильник-морозильник ХМ-6221-100 (инв. № 00445664), холодильник-морозильник ХМ-4012-022 (инв. № 00445530), холодильный агрегат Сплит-система (инв. № 00444187), холодильный шкаф ШХ-0,56 (инв. № 00440800), 2 электропечи (инв. № 00440792, № 00440791), электросковорода СЭСМ-0,2Ч (инв. № 00445140), набор корпусной мебели «Орфей-7» (инв. № 00970384), набор мебели «Синявка» (инв. № 00970035), 20 стульев «Тирамису-дуо алюм»120*74 (инв. №№ 00970320-00970335, 00970346- 00970349), стол для заседаний (инв. № 00970090), 11 шкафов металлических гардеробных на 2 отделения (каждое разделено пополам) (инв. № 00970362-00970372). Объекты продаются в собственность без условий.
Площадь земельного участка 1,9065 га, кадастровый номер 724050100001004662 предоставлен в постоянное пользование.
Объект продается без условий.
Начальная цена продажи **3 587 980 000** (три миллиарда пятьсот восемьдесят семь миллионов девятьсот восемьдесят тысяч) рублей с учетом НДС 20%.
Сумма задатка **358 980 000** (триста пятьдесят восемь миллионов девятьсот восемьдесят тысяч) рублей.

Аукцион состоится **31 марта 2015 г. в 15.00** по адресу: Кричевский район, Краснобудский сельсовет, 2 АБК в районе месторождения «Каменка», актовый зал.

Продавец объекта – ОАО «Кричевцементношифер».
Организатор аукциона – ООО «БелИнвестОценка».

Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с №3012150544012 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Аукцион проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести объект. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе аукциона участники могут предлагать свою цену за продаваемый объект в соответствии с порядком проведения аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 **по 30.03.2015 включительно** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411 (здание ГО «Белресурсы»). Заключительная регистрация участников **31.03.2015 с 14.00 до 14.45** по месту проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «Кричевцементношифер» не позднее 5 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи с 10.00 до 17.00.

Контактный телефон продавца в г. Кричеве 8 044 715 94 24.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-28-50, 398-29-44, 8 (029) 142 33 07; e-mail: belinvo@tut.by, на сайте belinvo.by.

Извещение об аукционе напечатано в газете «Звязда» 30.12.2014 № 247 (27857).

Утерянный бланк строгой отчетности «Страховой полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний» формы 2РН серии БН № 2295586 в количестве 1 штуки в Представительстве Белгосстраха по Любанскому району **считать недействительным.**

УНП 100122726

Утерянные квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» формы 1-СУ серии КС №№ 8528745, 8527872 **считать недействительными.**

УНП 100357923

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ЗА 2014 ГОД ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МОЗЫРСКИЙ НЕФТЕПЕРЕРАБАТЫВАЮЩИЙ ЗАВОД»

247760, Республика Беларусь, Гомельская область, г. Мозырь-11

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2014 года

Наименование показателя	Код строки	На 31 декабря 2014 г.	На 31 декабря 2013 г.
1	2	3	4
АКТИВЫ			
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	10 027 373	9 635 811
Нематериальные активы	120	24 691	14 703
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	5 258 317	3 339 999
Долгосрочные финансовые вложения	150	87 414	92 544
Отложенные налоговые активы	160	190	1
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	2 929	20 135
Прочие долгосрочные активы	180	360 112	318 662
ИТОГО по разделу I	**190**	**15 761 026**	**13 421 855**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	1 996 009	2 784 329
Расходы будущих периодов	230	4 438	6 617
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	12 970	24 758
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	2 573 415	1 608 274
Краткосрочные финансовые вложения	260	193 857	11 066
Денежные средства и их эквиваленты	270	931 397	558 437
Прочие краткосрочные активы	280	1	53
ИТОГО по разделу II	**290**	**5 712 087**	**4 993 534**
БАЛАНС	**300**	**21 473 113**	**18 415 389**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	7 907 128	5 930 346
Резервный капитал	440	26 565	19 254
Добавочный капитал	450	4 782 867	5 522 601
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	4 910 462	2 182 384
ИТОГО по разделу III	**490**	**17 627 022**	**13 654 585**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	682 130	400 673
Отложенные налоговые обязательства	530	196	-
Доходы будущих периодов	540	399	428
Прочие долгосрочные обязательства	560	24 813	17 364
ИТОГО по разделу IV	**590**	**707 538**	**418 465**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	12 980	1 243 925
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	188 991	286 697
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	2 936 582	2811 717
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	684 632	1 347 572
по авансам полученным	632	1 616 988	638 815
по налогам и сборам	633	598 057	791 239
по социальному страхованию и обеспечению	634	9 270	6 805
по оплате труда	635	19 539	15 414
прочим кредиторам	638	8 096	11 872
ИТОГО по разделу V	**690**	**3 138 553**	**4 342 339**
БАЛАНС	**700**	**21 473 113**	**18 415 389**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2014 г.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ	Код строки	За январь – декабрь 2014 г.	За январь – декабрь 2013 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	32 926 078	28 014 857
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(27 253 438)	(24 980 308)
Валовая прибыль (010-020)	030	5 672 640	3 034 549
Управленческие расходы	040	(459 813)	(377 665)
Расходы на реализацию	050	(847 874)	(803 147)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 - 040 - 050)	060	4 364 953	1 853 737
Прочие доходы по текущей деятельности	070	14 231 555	13 429 017
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(14 489 899)	(13 567 780)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-80)	090	4 106 609	1 714 974
Доходы по инвестиционной деятельности	100	251 781	259 413
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(52 052)	(57 982)
Доходы по финансовой деятельности	120	342 063	264 181
Расходы по финансовой деятельности	130	(631 173)	(433 907)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	(89 381)	31705
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	4 017 228	1 746 679
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	3 247 381	1 392 611

■ Рэдкае хобі

Гальштукі бываюць і драўлянымі,

або За што мужчыны могуць быць удзячныя амерыканскім паліцэйскім?

Рабочы з Віцебска Уладзімір Уданоўскі каля дзесяці гадоў збірае гальштукі і бабачкі. У яго незвычайнай калекцыі ўжо больш за 100 экзэмпляраў. Іх можна ўбачыць на выставе ў Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М.П.Шмырова. Карэспандэнт «Звязды», які не носіць гальштукі, сустрэўся з чалавекам, які мае рэдкае хобі.

ПАН КАЛЕКЦЫЯНЕР

Рабочы, які з задавальненнем носіць гальштукі ды ўмее іх завязваць, — гэта, пагадзіцеся, рэдкая з'ява.

— Так, я працую рабочым — на віцебскім абутковым прадпрыемстве «Сан Марка». І на працу, здараецца, прыходжу з гальштукам на шыі. І што? Я люблю гальштукі! Дарэчы, многія здзіўляюцца, чаму я, маючы вышэйшую адукацыю, працую транспарціроўшчыкам, а раней — на іншай рабочай «пасадзе»... Калісьці вучыўся ў Віцебскім каледжы мастацтваў, потым у Смаленскім інстытуце мастацтваў. А пайшоў рабочым на прадпрыемства, таму што на той час там плацілі параўнальна нядрэнна.

Што яшчэ здзіўляе, ён прынцыпова не карыстаецца мабільным тэлефонам. Праўда, не супраць іншых выгод нашага стагоддзя віртуальных тэхналогій. У прыватнасці, у сацыяльнай сетцы ёсць яго старонка. Сярод мноства здымкаў там ёсць і фота ў вобразе нейкага пана.

— Ну не люблю мабільную сувязь! Мне зручна дамаўляцца аб сустрэчах па праводным тэлефоне і ў інтэрнэце... А што тычыцца фота, якія вас зацікавілі, я здымаўся ў Віцебску — у масоўцы расійскага фільма. Прачытаў у інтэрнэце аб'яву, на кастынгу мяне выбралі для здымак. Было цікава, з «зоркамі» кіно пазнаёміўся, — тлумачыць Уладзімір.

Мо і яшчэ будзе здымацца! Ён — сябра клуба ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Таварышы па зброі» (які пастаянна супрацоўнічае са згаданым вышэй музеем). Мужчыны і жанчыны ў ваеннай форме часоў Вялікай Айчыннай паказваюць фрагменты вайны ў тэатралізаваным выглядзе.

АКСЕСУАР З САКРЭТАМ

Пра гальштукі ён расказвае так, што слухаў бы і слухаў. Дарэчы, а як можна назваць тых, хто гальштукі збірае? «Гальштучнікі»? Упершыню ў жыцці шукаў у інтэрнэце адпаведную назву, але не знайшоў.

— Грабарыст, — падказвае калекцыянер. — Слова ўзнікла пры перакладзе з адной з моў слова «гальштук». А ў перакладзе з нямецкай Halstuch значыць «шыйная хустка». Ёсць некалькі версій таго, калі людзі пачалі насіць гальштукі. У старажытным Егіпце іх насілі тыя, хто мелі прывілеі. Але некаторыя гісторыкі

Гальштукі з выставы.

сцвярджаюць, што гэты аксесуар адкрылі свету кітайцы. Некаторыя лічаць, што гальштукі пайшлі ад рымскіх легіянераў, якія насілі тканіну на шыі, каб даспехі не намуль валі скуру... Я чытаў пра тое, што на Русі правобразы гальштукаў з'явіліся падчас праўлення Пятра I. Калі чалавека вешалі «няўдала», паўторна пакараць смерцю забаранялася. Але шчасліўчыкі павінны былі ўсё жыццё публічна насіць кавалак вяроўкі на шыі. А вы ведаеце, хто першым пачаў насіць заціскі для гальштукаў? Амерыканскія паліцэйскія па пачатку Другой сусветнай. І гэта спатрэбілася, каб іх... не задушылі зладзеі, якіх яны затрымлівалі. Без заціскаў вельмі лёгка зацягнуць гальштук і...

У калекцыі Уладзіміра гальштукі з розных краін, розных часоў вырабу, тканін.

— Усе яны для мяне па-свойму дарагія. «Любімчыкаў» няма! Самы першы быў прывезены з Балгарыі мамай, калі яшчэ я не нарадзіўся. Гэты гальштук — аранжавага колеру! Доўгі час ён ляжаў у яе ў шафе, пакуль я не ўбачыў. Прымяраў, але як насіць такі на афіцыйныя мерапрыемствы? Купіў шэры гальштук, потым вось гэты з доларамі (*паказвае*). Даволі хутка зразумеў, што мне падабаюцца розныя гальштукі. Стаў купляць, абменьвацца...

Паводле слоў калекцыянера, у часы СССР не было гальштукаў кідкіх колераў, а толькі класічныя: чорны і шэры, калі з палоскамі, дык стандартнымі. Часам гальштукі ўпрыгожваліся белым гарохам. Што добра, усе выраблялі з натуральнай тканіны, у наш час большасць — са штучнага шоўку.

— У 1990-я гады на постсавецкім «рынку» назіраўся «росквіт» гальштукаў. Вось, напрыклад, з люрэксам — вузенькія. Дарэчы, і дамы насілі такія. Гэта шыкам лічылася. Мне падабаюцца гальштукі з «сакрэтам». Вось, бачыце, упрыгожаны «гарохам», а калі прыглядзецца, горах — гэта свінка... А цяпер уваходзяць у моду драўляныя гальштукі. Робіцца аснова з драўніны, паверх нацягваецца тканіна... Сабраў гальштукі з ЗША, Вялікабрытаніі, Швейцарыі і іншых краін. Самы дарагі па цане — ад Крысціяна Дзіёра (яго падарылі), ёсць і эксклюзіўныя — выраблены нашымі майстрамі ў адным экзэмпляры, — зноў здзіўляе Уладзімір.

Што дзіўна, нават «кніга водгукаў», у якой можна падзяліцца ўражаннямі ад убачанага на выставе, зроблена ў форме гальштука. Дзе такое яшчэ ўбачыць можна?

— Шчыра дзякую супрацоўнікам музея за тое, што прапанавалі мне паказаць калекцыю. Прапанову атрымаў, калі аднойчы прыйшоў сюды з аранжавым гальштукам на шыі. Разгаварыліся з дырэктарам, і скончылася гэтай выставай, — смяецца калекцыянер.

HALSTUCH — У ДАР

Уладзімір расказаў, што ў Мінску толькі аднойчы арганізавалі выставу гальштукаў, якія належаць латвійскаму дыпламату.

Уладзімір з «кнігай водгукаў», у якой можна падзяліцца ўражаннямі наконт выставы.

Каб папоўніць сваю калекцыю, У. Уданоўскі купляе гальштукі, калі бачыць адпаведныя аб'явы ў інтэрнэце, прымае ў дар. Дарэчы, мо хто з чытачоў хоча падарыць гальштук ці прадаць, тэлефануйце ў віцебскі карпункт «Звязды». Абавязкова перадам інфармацыю Уладзіміру.

«Калі чалавека вешалі «няўдала», паўторна пакараць смерцю забаранялася. Але шчасліўчыкі павінны былі ўсё жыццё публічна насіць кавалак вяроўкі на шыі».

— Наведвальнікам музея выстава вельмі спадабалася. Дарэчы, легендарны Шмыроў, імя якога носіць музей, быў ганаровым піянерам дружыны адной з віцебскіх школ. У нас ёсць той самы гальштук, які яму завязалі дзеці... Перыядычна калекцыянеры, якія збіраюць маркі, паштоўкі, календары, фотаапараты і іншае, прапаноўваюць арганізаваць выставу. Але адмаўляем, бо такое хобі «на слыху». А каб чалавек гальштукі збіраў, гэта насамрэч цікава. І вялікая каштоўнасць калекцыі ў неардынарным падыходзе да яе фарміравання. Ёсць і форменныя гальштукі, і ручной работы... Гальштукі могуць стаць падставай для вывучэння гісторыі, геаграфіі, а мо каго зацікавіць тэхналогія вырабу? У прыватнасці, тканіна абавязкова з трох частак па дыяганалі складаецца, каб гальштук не цягнуўся, добра на шыі «ляжаў», — расказала карэспандэнту «Звязды» дырэктар установы культуры Ірына Шышкова.

Паводле яе слоў, выстава будзе працаваць яшчэ пару дзён. Калі завітаеце ў Віцебск, абавязкова наведайце яе. Калекцыянер будзе рады прадставіць калекцыю ў іншым музеі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ВУЧЫМСЯ РАЗАМ: ПРЫШЧЭПКА НОВЫХ САРТОЎ

Як жа няпроста вясной праехаць міма месцаў, дзе прадаюцца саджанцы! Так і хочацца купіць новыя сарты і яблынь, і груш, і сліў... А прывязеш дрэўцы на свой участак і не ведаеш, куды падзець навасёлаў. Але рашэнне праблемы ўсё ж ёсць. Гэта прышчэпка новых сартоў у кроны дрэў, якія ўжо растуць на ўчастку. Паверце, нічога складанага ў гэтай справе няма. Усяго і трэба — востры нож, скрутак ізастужкі, некалькі цэлафанавых пакетаў, кавалак шпагату і, уласна, чаранкі для прышчэпкі. Выдаткі, як бачым, мінімальныя, а ў выніку можам са звычайнай антонаўкі атрымаць салодкія яблыкі. Можам мужчынскую расліну абляпіхі замяніць некалькімі прышчэпленымі галінкамі ў кроне жаночай. Можам самабясплодныя чарэшню ці сліву «ўгаварыць» запладаносіць, калі сярод іх галінак «пасяліць» чаранкі сартоў-апыляльнікаў.

ШЧЭПА

Галоўная ўмова паспяховай прышчэпкі — гэта спячыя (якія не пачалі брыняць) пупышкі на чаранках. Улічыце яшчэ, што рух соку ў костачкавых культур пачынаецца вельмі рана. Чаранкі лепш за ўсё браць з цэнтральнай або верхавіннай часткі дрэва з паўднёвага боку. Тут найбольш выспелыя пупышкі і поўны запас рэзервовых пажыўных рэчываў. Для прышчэпкі падыходзяць толькі прыросты мінулага года. Яны маюць спецыфічныя прыкметы: знаходзяцца на канцах галін, прамыя з гладкай маладой светла-карычневай карой і шчыльна прыціснутымі невялікімі пупышкамі. Даўжыня прыростаў можа быць ад 15 см да метра, дыяметр — ад 3 мм да 8—10 мм. Зрэзаўшы такую галінку, звярніце ўвагу на колер стрыжня. Калі яна светла-зялёная або белаватая — значыць, дрэвы перазімавалі выдатна, а чаранок вышэйшай якасці. Калі ёсць карычневае адценне, то тканкі, напэўна, падмарожаныя. Галіны ж з цёмным або папялістым колерам стрыжня для прышчэпкі не падыходзяць.

Каб захаваць чаранкі да надыходу найбольш спрыяльнага часу прышчэпкі, іх складваюць пучкамі па чаранках, падпісваюць, каб не пераблытаць. Абгортваюць вільготнай (не мокрай!) анучай ніжнія месцы зрэзаў і шчыльна закручваюць поліэтыленавай плёнкай або мяшком. Гэты пакет можна змясціць у халадзільнік або склеп з тэмпературай не вышэй за 2-3 градусы цяпла.

НОЖ

Пэўную ўвагу трэба надаць і падрыхтоўцы галоўнага інструмента — нажа. Гэта можа быць як пакупны спецыяльны прышчэпачны нож, так і самаробны з нарыхтоўкі для шавецкага нажа. Агульнае патрабаванне — інструмент павінен быць завостраны так, каб галіў валасы на руцэ. Для такой падрыхтоўкі скарыстайцеся спачатку брускамі, а затым дробназярністай наждачнай паперай. Фінішная аперацыя — даводка на скураным рамяні ці кавалку лямцу, нацёртым пастай гоі. Цяпер вельмі карысным будзе патрэніраваць падразаць чаранкі. Для гэтага з нарыхтаванай галінкі выразаецца сярэдняя частка з 2—4 пупышкамі, якая бярэцца ў левую руку, а нажом у правай руцэ акуратна, за адзін праход, трэба зрабіць касы зрэз даўжынёй каля 4 см. Тое ж самае робім на другім баку. Атрымліваем два касыя зрэзы ў ніжняй частцы чаранка.

ЧАС ЗА СПРАВУ

З канца сакавіка да сярэдзіны красавіка самы час адпраўляцца ў сад прышчапляць і перапрышчапляць дрэвы. Аперацыя гэтая лічыцца хірургічнай, таму вельмі важныя чысціна інструмента, сабранасць, уважлівасць і хуткасць дзеянняў садоўніка. Сутнасць прышчэпкі і гарантыя поспеху ў тым, каб злучыць жывыя, біялагічна роднасныя тканіны шчэпы (гэта наш чаранок) і прышчэпы (гэта расліна, на якую мы прышчапляем). Гэтыя тканкі размешчаны паміж карой і драўнінай і называюцца камбій. Менавіта яго клеткі з вясны і да восені ўзмоцнена дзеляцца і здольныя за кароткі час зрастацца адна з адной так, што ўтвараюць адзінае цэлае.

Рыхтаваць чаранок трэба па магчымасці хутка, не дапускаючы падсыхання валокнаў драўніны і камбію. Недапушчальна датыкацца да зрэзаў рукамі.

Прышчапляць лепш за ўсё ў тую частку кроны дрэва, дзе ідуць актыўныя роставыя працэсы. Гэта добра асветленыя сонцам сярэднія і верхавінкавыя галіны таўшчынёй да 3 см. Прышчэпкі на ніжніх галінках развіваюцца, як правіла, слаба.

Калі дрэва маладое і таўшчыня прышчэпы і шчэпы амаль супадаюць, можна прышчапляць спосабамі ў расшчэп, простай або палепшанай капуліроўкай. Важна сумясціць камбіяльныя слаі хоць бы з аднаго боку. На больш тоўстыя галінкі лепш прышчапляць спосабам у бакавы зарэз кары (калі робіцца касы надрэз кары на ўсю таўшчыню, а чаранок мае ўнізе зрэз накшталт вельмі вастравугольнага трохвугольніка).

Праз год, калі будзе ясна відаць, што прышчэпка ўдалася, верхнюю частку галінкі прышчэпы зразаюць, а прышчэпка ўтварае працяг галіны, толькі ўжо, зразумела, новага сорта.

Гэты спосаб добры тым, што ў выпадку няўдачы рана за лета зарастае і памылка лёгка выпраўляецца наступнай вясной.

Важная дэталь: даўжыня чаранка звычайна складае максімум 4 пупышкі, лепш — дзве-тры.

Рыхтаваць чаранок трэба па магчымасці хутка, не дапускаючы падсыхання валокнаў драўніны і камбію. Недапушчальна датыкацца да зрэзаў рукамі.

Калі чаранок злучаны з прышчэпай, сцісніце іх пальцамі левай рукі, а правай пачынайце фіксаваць ізастужкай. Прычым першы слой матаецца ліпкім бокам вонкі, каб потым, пры зняцці стужкі, за ёй не адставала кара. Наматаўшы першы слой, проста перавярніце катушку і абматайце з нацягам яшчэ некалькімі слаямі. Пры гэтым адбываецца больш шчыльнае прыляганне камбіяльных слаёў.

Многія раяць шчодра нанесці па стужкі садовы вар або абкітоўку. Але рабіць гэтага не варта. Справа ў тым, што сучасныя садовыя абкітоўкі робяцца на аснове нафтапрадуктаў. Дзённае сонца растоплівае абкітоўку, і тоненькая тлушчавая плёнка перашкаджае зрастанню шчэпы з прышчэпай.

А цяпер, каб ахаваць пупышкі чаранка ад высушвання ветрам і сонцам, надзеньце на прышчэпку экран — цэлафанавы пакет, папярэдне зрэзаўшы ў яго куткі, і няшчыльна прывяжыце яго да прышчэпы. Як толькі стане ясна, што пупышкі чаранка пайшлі ў рост (а гэты час можа скласці і месяц), пакет зніміце.

Праз месяцы два акуратна разматайце ізастужку. А далей як хочаце: калі чаранок падаўжэў у межах 20 см, то месца злучэння можна зноў пераматаш ізастужкай для прадухілення адлому і пакінуць так да наступнага года. Калі ж прырост большы за 20 см, прышчэпу са шчэпай пажадана змацаваць шынай з падыходзячай рэйкі.

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ЛЫЖКА. Паводле ўсходнеславянскіх традыцый, лыжка была не проста прадметам хатняга начыння, яна ўвасабляла сабой пэўнага члена сям'і, бо кожны меў сваю лыжку.

◈ Кожная лыжка ў хаце абавязкова пазначалася адмысловымі знакамі, а таксама адрознівалася па памеры: у гаспадара была самая вялікая, у астатніх членаў сям'і — меншыя. Яшчэ з часоў Кіеўскай Русі вельмі маленькія лыжкі лічыліся знакам сытасці, дабрабыту і дастатку, а таму выконвалі ролю асабістага амулета.

◈ Паводле народнага этыкету, забаранялася змешваць ці накладваць ежу лыжкай кагосьці з дамачадцаў, асабліва мужа ці гаспадара. Лічылася, што тады мужчыны будуць лезці ў жаночыя справы і гэта абавязкова прывядзе да сварак.

◈ Імкнуліся, каб на стале не было лішніх лыжак, інакш яна неўзабаве «застанецца» без свайго гаспадара. «Некранутай» была лыжка толькі на жалобным стале — тая, якой еў памерлы.

◈ Існавала забарона бразгатаць і ляскатаць лыжкамі ў той час, калі гаспадыня накрывае або прыбірае са стала: суседзі стануць абгаворваць, «па вёсцы пабягуць плёткі».

◈ У народным асяроддзі існавала строгае правіла, якое патрабавалася выконваць няўхільна: карыстацца чужой лыжкай забаранялася. Для параўнання — у чарнагорцаў існуе праклён, што гучыць у літаральным перакладзе так: «Каб твая лыжка зламалася».

◈ Лічылася, што можна наклікаць на членаў сям'і беды і хваробы, калі пазычаць лыжкі: «З усіх рэчаў сельскага ўжытку толькі лыжку не купляюць у суседзяў і не пазычаюць: калі ўжо яе прынеслі ў чужы дом, яна робіцца ўласнасцю той сям'і. Суседава просьба пазычыць лыжку роўная просьбе яе падараваць. Зусім іначай з нажом, які трэба купляць».

◈ Да вяселля для маладых падрыхтоўвалі дзве новыя лыжкі, якія пасля застолля звязвалі чырвоным поясам і прыгаворвалі: «Як гэтыя лыжкі звязаны-злучаны дужа-моцна, так бы і маладыя адно з адным злучаны былі». Пасля гэтага лыжкі хавалі і ніколі больш імі не карысталіся.

Даты Падзеі Людзі

18 САКАВІКА

1662 год — у Парыжы з'явіўся першы грамадскі транспарт. Гэта была васьміесная карэта, прэтэнцыёзна названая «амнібус», што азначала — «для ўсіх». Карэта рухалася на коннай цязе. Прызначалася ў асноўным «для асоб, якія не маюць магчымасцяў карыстацца паланкінам або карэтай». Але ў хуткім часе ўлады, падумаўшы, забаранілі ездзіць у амнібусе людзям нізкага звання. Праз гэта такі транспарт пачаў прыходзіць у заняпад, пазбавіўшыся асноўнай масы пасажыраў. І толькі ў пачатку XIX стагоддзя амнібус зноў з'явіцца ў Еўропе. Ён камбінаваў функцыі рамізніка і дыліжанса: як рамізнік, амнібус перавозіў пасажыраў у горадзе; як дыліжанс, амнібус быў маршрутным транспартным сродкам, які перавозіў вялікую колькасць пасажыраў на далёкія адлегласці. Аднак манапалізм амнібусаў доўжыўся нядоўга: ужо ў трыццатых гадах XIX стагоддзя ў гарадах з'явіліся першыя конкі.

1921 год — заключаны Рыжскі мірны дагавор. У лістападзе 1918 года, пасля паражэння Германіі ў Першай сусветнай вайне, Польшча была абвешчана незалежнай дзяржавай. Паўстала пытанне аб межах новай дзяржавы. Асноўнай мэтай кіраўніцтва на чале з Юзэфам Пілсудскім было аднаўленне Польшчы ў гістарычных межах Рэчы Паспалітай 1772 года. Неўзабаве пачаўся ўзброены канфлікт з Савецкай Расіяй. 18 сакавіка 1921 года паміж варагуючымі бакамі ў Рызе быў заключаны мірны дагавор. Згодна з дакументам, да Польшчы адышлі заходнія землі Украіны і Беларусі. Дагавор дзейнічаў да 17 верасня 1939 года, калі ў сувязі з распадам польскай дзяржавы былі анулюваныя ўсе дагаворы і пагадненні, а Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь увайшлі ў склад Савецкага Саюза.

1935 год — 80 гадоў таму нарадзіўся (вёска Селішча, цяпер Навагрудскі раён) Аляксандр Мікалаевіч Булыка, беларускі вучоны, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі. У 1959 годзе скончыў БДУ. Даследаваў гісторыю беларускай літаратурнай мовы. Ім распрацаваны пытанні гістарычнай лексікалогіі беларускай мовы, старабеларускай фанетыкі, марфалогіі і арфаграфіі, асаблівасці мовы выданняў Ф. Скарыны. Аўтар больш як 300 навуковых прац, у тым ліку 10 манаграфій, аўтар і суаўтар 17 слоўнікаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998).

Было сказана

Павел ПРУДНІКАЎ, паэт, празаік:

Пражытым даражы
І ў сённяшнім не кісні.
Жыццё — не міражы,
Жыццё — жывая ісціна.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.18	19.19	12.01
Віцебск	7.08	19.08	12.00
Магілёў	7.08	19.09	12.01
Гомель	7.05	19.05	12.00
Гродна	7.33	19.34	12.01
Брэст	7.34	19.35	12.01

Месяц

Маладзік 20 сакавіка.
Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Іраіды, Івана, Канстанціна, Фёдара.*
К. *Фаіны, Кірылы, Эдуарда.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Люба, вы ўся такая падцягнутая, грацыёзная. Як у вас гэта атрымліваецца?
— Я займаюся народнымі танцамі.
— Як цікава! А якімі?
— Стрыптызам.
— А... Хіба гэта народныя танцы?!
— Ну, не ведаю... Народу падабаецца.

Калі ты не дазволіш сабе з'есці цукерку сёння, праз тыдзень ты з'ясі цэлы торт. Гэта называецца «эфект тоўстага матыля».

— Мама, я цяжарная.
— Сарачка, у цябе ўжо чацвёртае дзіця, і ўсе ад Фімы! Чаму ты не выйдзеш за яго?!
— Ён мне не падабаецца.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.012. Індэкс 63850. Зак. № 1074.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 сакавіка 2015 года.